Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР.

Кошт нумару 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў)

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Незакарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. На 3 месяцы — р. 70 к. На 6 месяцаў — р. — к. На 1 год — р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шпарагі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шпарагі перад тэкстам 1 р. — к. Вялікадзюк шпарагі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпісныя на 50 проц. дарожай. Зьмена тэксту бярэцца 10 проц. дадатку.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент . . 35 кап. За кожны дадатковы . . 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумент . . 10 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і за ўсіх аддз.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА: канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 238 (2727) Чацьвер, 17-га кастрычніка 1929 г.

154 кр. "Савецкая Беларусь" Одесса, Пастера 3, государ-стен. публичн. библиотека. ступ. сьнет. адзін экз.

Крок наперад.

Каля двух месяцаў працавала ўрадавая камісія па рэарганізацыі Віцебскай акругі ў вопытна-паказальную. Больш васьмі тыдняў уся савецкая грамадзкасьць ня толькі Віцебшчыны, але часткова і ўсяе БССР была занята пытаньнем наладжваньня работы і набліжэньня да мас савецкага апарату Віцебскай акругі. Менавіта апошнім і займаліся ўсе савецкія арганізацыі, які ставілі пытаньне аб рэарганізацыі „шэйпамянёнай акругі ў вопытна-паказальную.

Спрашчэньне і патаньненьне савецкага апарату, набліжэньне яго да мас і раўчае палепшаньне яго работы ляжыць у аснове ўсяе работы па рэарганізацыі апарату Віцебшчыны. Гэтая работа ў сучасны пэрыяд выклікана разгортваньнем тэмпу індустрыялізацыі і вялікімі зрухамі ў сельскай гаспадарцы, якая пераходзіць усе больш і больш на калектыўныя рэйкі. Разгортваньне гэтага будаўніцтва як у горадзе, так і ў вёсцы патрабуе рашучага пазбаўленьня ад усяе спадчыны мінулага і ў нашым апараце. Барацьба з бюракратызмам, прыцягненьне рабочых і батрацтва, беднаты і серадняцтва да яшчэ большага ўдзелу ў рабоце саветаў патрабавала зрабіць некаторыя крокі наперад у галіне рэарганізацыі нашага савапарату.

Работа па наладжванню і яшчэ большаму набліжэньню апарату да мас праводзіцца ва ўсіх куткох Савецкага Саюзу, праводзіцца стала і паступова, але Віцебская акруга рэарганізуецца ва ударным парадку. Рэарганізацыя савецкага апарату ў Віцебскай акрузе пашла значна глыбей і шырэй, чым можна гэта правесьці адразу ва ўсёй рэспубліцы.

Сёньня мы друкуем пастанову Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР пра рэарганізацыю акругова-райённай сыстэмы кіраўніцтва Віцебскай вопытна-паказальнай акругі. Гэтая пастанова фактычна зацьвярджае тую работу, якая праведзена камісіяй ЦВК і савецкімі, а таксама партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі Віцебшчыны. Згодна гэтай пастановы значная частка апэрацыйных функцый акруговага апарату перадаецца райённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам, а частка функцый райённага апарату перадаецца сельскім і местачковым саветам і гарадзкім саветам неакруговых гарадоў. Такім чынам мясцовыя ніжэйшыя арганізацыі атрымліваюць большыя правы і на іх ўскладаюцца большыя абавязкі. Большасьць работы перападае на нізавыя арганізацыі нашага апарату. За акруговым жа апаратам застаецца работа па кіраўніцтву райённымі арганізацыямі і па пляванаму рэгуляваньню работы палітычнай, гаспадарчай і культурнай.

У сувязі з гэтым праводзіцца ўзмацненьне работнікамі нізавых арганізацый і значнае скарачэньне штатаў акруговых установаў, а таксама і аб'яднаньне функцый некалькіх акруговых установаў.

Савецкі апарат Віцебшчыны ўжо фактычна перайшоў на новыя формы і мэтады работы. Ад усяго апарату мы патрабуем больш чоткасьці ў рабоце, больш правільнага, хуткага і поўнага выкананьня задач, якія ставіць перад ім наша сучаснасьць. Ад працаўнікоў гэтага новага, рэарганізаванага апарату мы патрабуем большага ўменьня, большай уважлівасьці, большай чулясьці да запатрабаваньняў рабочых, батрацтва, беднаты і серадняцтва. Усе работнікі гэтага апарату павінны памятаць аб тым, што менавіта на іх работу будуць глядзець як на паказальную, што за яе работай будуць сачыць усе працоўныя нашай краіны.

Працаўнікі савецкага апарату Віцебшчыны павінны будуць паведамляць усю савецкую грамадзкасьць нашай рэспублікі аб сваёй рабоце, аб сваіх посьпехах, дасягненьнях.

Рэдакцыя газэты „Савецкая Беларусь" запрашае сваіх рабселькораў Віцебшчыны і ўсіх рабочых і служачых і бяднейшае селянства прыняць удзел у асьвятленьні работы рэарганізаванага апарату Віцебшчыны. „Савецкая Беларусь" са здвальненьнем будзе адводзіць свае старонкі для асьвятленьня як работы і палепшаньня ўсяго апарату, так і спэцыяльна асьвятленьня апарату Віцебшчыны.

Рыхтуйцеся да ўсесаюзнага зьезду ўдарнікаў.

6-га сьнежня склікаецца першы ўсесаюзны зьезд рабочых-ударнікаў; перад зьездам адбудуцца цэхавыя, агульна-фабрычныя і акруговыя канфэрэнцыі. Гэтаму зьезду партыя надае вялікае палітычнае і гаспадарча-практычнае значэньне. Зьезд павінен будзе падагуліць багаты вопыт і практыку ўсесаюзнага спаборніцтва, мабілізаваць увагу шырокіх мас рабочых і наогул працоўных на задачах 2-га году пяцігодкі і дапамагаць далейшаму рашучаму наступу рабочае клясы па ўсяму фронту сацыялістычнага будаўніцтва.

Зьезд будзе адзначаць сабою новую веху ў разьвіцьці сацыялістычнага спаборніцтва і зьявіцца па сутнасьці пераломным этапам ва ўмацаваньні працоўнае пралетарскае дыцыпліны на нашых прадпрыемствах. Сацыялістычнае спаборніцтва, высунутае самімі масамі ў пэрыяд агрэмаднай рэканструкцыі народнае гаспадаркі, да гэтага часу не разгарнулася яшчэ вусім шырока. У спаборніцтве ўдзельнічаюць пакуль што перадавыя атрады рабочае клясы, шырокія-ж масы рабочых у яго яшчэ ня ўцягнуты.

Таму асноўная задача гэтага зьезду і канфэрэнцый у тым, каб пад кіраўніцтвам партыі намеціць найбольш кароткія шляхі да гэтых мас, шырока папулярызаваць сярод іх ідэю ўдарніцтва і ўцягнуць праз сацыялістычнае спаборніцтва ў вялізарнае будаўніцтва 2-га году пяцігодкі пагалоўна ўсіх рабочых, усіх спэцыялістаў і наогул працоўных. Зьезд павінен таксама дапамагчы разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва і на вёсцы. Скліканочы рабочых-ударнікаў на ўсесаюзную нараду, партыя тым самым падкрэсьлівае аграмаднае значэньне ўдарніцтва ў справе ажыцьцяўленьня намечаных гаспадарчых задач. Партыя імкнецца выклікаць і даць шырокі прастор узрастаючай творчай ініцыятыве мас і гаспадарчаму вопыту мілёнаў, асабліва там, дзе гэты вопыт яшчэ застаецца зацісьнутым валакітаю і бюракратызмам, дзе ўдарнікі ўпарта шукаюць, але да гэтага часу не знаходзяць да сябе і да сваёй працы належнае ўвагі з боку партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый.

Бюракратычныя ціскі, якія скоўваюць на асобных вучастках творчы энтузіязм і працоўны парыў мас да спаборніцтва, павінны быць і будуць канчаткова і рашуча зьбіты сіламі ўсёй партыі і рабочае клясы. У асобе ўдарнікаў рабочая кляса ўжо дала савецкай краіне новых рабочых, якія адпавядаюць патрабаваньням рэканструкцыйнага пэрыяду, рабочых з глыбокай рэвалюцыйнай верай у посьпех сацыялістычнага будаўніцтва. Палітычныя і гаспадарча-практычныя задачы зьезду ўдарнікаў павінны быць шырока папулярызаваць сярод адсталых рабочых. Трэба дамагчыся, каб ня толькі ўдарнікі, але і ўсе рабочыя і спэцыялісты былі прыцягнуты да актыўнага ўдзелу ў падрыхтоўцы да ўсесаюзнага зьезду ў да цэхавых, агульна-заводзкіх і акруговых канфэрэнцый ударнікаў. Чым шырэй мы здолеем разгарнуць і арганізаваць гэтую падрыхтоўку, тым больш мы ўцягнем у яе рабочых і спэцыялістаў, тым больш рэальным будзе палітычны і практычны посьпех першага зьезду ўдарнікаў і далейшага разьвіцьця сацыялістычнага спаборніцтва.

Як падрыхтоўка да зьезду, так і канфэрэнцыі павінна праводзіцца ў самай шчыльнай і непарыўнай сувязі з распачатай праверкай дагавораў сацыялістычнага спаборніцтва і павінны абярнуцца ў шырокую масавую кампанію па растлумачэньні і папулярызацыі задач сацыялістычнага спаборніцтва. Побач з гэтым падрыхтоўка павінна дапамагаць шырокаму ўцягненьню рабочых, работніц і спэцыялістаў у ўдарныя брыгады. Важнае значэньне будзе мець удзел у працы зьезду і канфэрэнцый рабочых і спэцыялістаў, якія ўдзельнічаюць у ўдарных рацыяналізатарскіх брыгадах. Такія брыгады ўжо ўтвораны ў Данбасе і на шэрагу іншых прадпрыемстваў. Гэты станоўчы вопыт і практыку мы павінны праз зьезд перадаць шырокім масам, прафсаюзным і гаспадарчым арганізацыям.

Вялікая адказная задача ў падрыхтоўцы да зьезду ўскладаецца на мясцовы і нізавы фабрычна-заводзкі друк і рабкораў. Партыя і рабочая кляса надаюць аграмаднае значэньне канфэрэнцыі і зьезду ўдарнікаў, якія павінны ў далейшым дапамагчы ўмацаваньню і разьвіцьцю сацыялістычнага спаборніцтва і ўцягненьню ў яго рабочых і спэцыялістаў, усіх працоўных.

Напружаныя задачы другога году пяцігодкі патрабуюць асаблівай выразнасьці ў працы ўсіх фабрычна-заводзкіх арганізацый, высокіх тэмпаў у працы, пагалоўнага ўдзелу мас у сацыялістычным будаўніцтве. Сацыялістычнае спаборніцтва павінна зрабіцца магутным рычагом рабочае клясы, з дапамогаю якога мы пераможам усе цяжкасьці і павядзём масы ў рашучую бойку за ажыцьцяўленьне генэральных задач нашае партыі.

„Правда".

Ці прызнае Амэрыка СССР.

НЬЮ ЁРК, 11-X. Перад выездам Макданальд радзіўся з сэнатарам Бора Згодна паведамленьня прэсы, Макданальд і Бора абмяркоўвалі пытаньні аб „свабодзе марэй" і адносінах да СССР. Як перадаюць, Бора заявіў, што амэрыканская грамадзкая думка ціпер стаіць за прызнаньне СССР. Чакаюць, што Бора распачне ў бліжэйшы час энэргічную кампанію за аднаўленьне зносін з Савецкім Саюзам. Водлуг вестак, атрыманых карэспандэнтам ТАСС з асьвядомленых крыніц, Макданальд і Гувэр не абмяркоўвалі пытаньняў аб адносінах да СССР.

Генэральская вайна ў Кітаі.

Посьпехі войск Фынь-Юй-Сяна,

ТОКІЁ, 15-10. „Ніцы-Ніцы" паведамляе, што Сун-Лян-Чэн разьбіў наккінскае войска ў Хэнані і захапіў Лёян.

* * *

ПЭЙПІН, 15-10. Говень паведамляе, што частка войска Фынь-Юй-Сяна, пад камандаю генэрала Пун-Пін-Сюна, выступіла з Нанчу на паўднёвы ўсход з яўным намерам перарэзаць Пэйпін-Ханькоўскую чыгунку.

* * *

ШАНХАЙ, 16-10. Нанкінскае агенцтва Гомінь ня спыняе заявраць, што становішча на поўдні складаецца спрыяюча для Нанкіну. Агенцтва Сімбун Рэнго паведамляе, што старшыня шандунскага ўраду Чэ-Цяно-Юань, які спачатку рашыў падтрымліваць выступленьне Фынь-Юй-Сяна, перадумаў і абвясьціў сябе прыхільнікам Нанкіну.

Нанкінскія войскі адыходзяць.

ШАНХАЙ, 16-X. Водлуг паведамленьня агенцтва Рэйтэра, войска Гамінцзюну наступае трыма калёнамі ўздоўж Луньхайскай і Пэйпін-Ханькоўскай чыгунак. Часьці Сюн-Лян-Чэна мінулі ўжо Лёян. Нанкінскае войска адыходзіць на ўсход, Нанкін групоўвае войска на поўначы Хубэю. У Ханькоў сьпешна пасланы самалёты і панцырнікі.

Чжан-Сюэ-Лян заяўляе аб нэйтралітэце

ШАНХАЙ, 16-X. У кітайскім друку Пэйпіну агалошана інтэрв'ю Чжан-Сюэ-Ляна, у якім ён заяўляе, што ён захавае нэйтралітэт у барацьбе між Гамінцзюнам і Нанкінам. Чжан-Сюэ-Лян разам з тым зазначае, што цэнтральны ўрад „не павінен быць урадам аднага чалавека».

Перад страхам камуністычных паўстаньняў.

НЬЮ-ЁРК, 14-X. Міністр замежных спраў Злучаных Штатаў лічыць становішча ў Кітаі сур'ёзным. Да выступленьня Фынь-Юй-Сяна міністр замежных спраў адносіцца адмоўна. Афіцыйныя колы чужаземнага кварталу баяцца, як-бы падзеньне нанкінскага ўраду ня выклікала камуністычных паўстаньняў.

37 савецкіх грамадзян засуджаны на 243 гады

ТОКІЁ, 14-X. Агенцтва Сімбун Рэнго паведамляе: „Сёньня ўдзень у Харбіне абвешчан прысуд па справе 37 савецкіх грамадзян і аднаго кітайца, арыштаваных 12-га мая пры наскоку паліцыі на савецкае консульства. Усе падсудныя, апроч кітайца, прызнаны вінаватымі. 5 асоб засуджана на 9 гадоў зьняволеньня кожны; 21 асоба—на 7 гадоў кожны, 7—на 5 гадоў, 4 грамадзянкі на 4 гады. Падсудны кітаец апраўдан.

Фашысцкі тэрор сустракае рашучы адпор з боку рабочай клясы.

„Кляса супроць клясы".

Пад такім лёзунгам камуністы разгортваюць прадвыбарчую агітацыю.

ПРАГА, 15-10. Цэнтральная выбарчая камісія зацьвердзіла 19 кандыдацкіх сьпісаў у палату дэпутатаў і 16 сьпісаў у сэнат, у сувязі з выбарамі, якія павінны адбыцца 27-га кастрычніка.

Пры жараб'ёўцы сьпіс кампартыі атрымаў першы нумар. З высунутых на першых мясцох 80 кандыдатаў кампартыі—55 рабочых ад варштату, 13 сялян, 12 партыйных працаўнікоў, з якіх палова—быўшыя рабочыя.

Міжпартыйная барацьба ў каліцыйным лягеры ў поўным разгары. У бруднай кампаніі, якую ўзьняслі сацыял-дэмакраты супроць кампартыі, яны дэмагагічна выкарыстоўваюць злачынную авантуру Пецяргофскага.

Камуністы разгортваюць перадвыбарчую агітацыю пад лёзунгам „кляса супроць клясы". Пры гэтым кампартыя непасрэдна зьвязвае сваю выбарчую кампанію падрыхтоўкаю да сьвяткаваньня 12-х угодак Кастрычнікавай рэвалюцыі. Учора паліцыя канфіскавала ў друкарні ўвесь перадвыбарчы тыраж плакатаў кампартыі на 6-ці мовах.

Забастоўка 4.500 шофэр грузчыкаў.

НЬЮ-ЁРК, 15-X. У Нью-Ёрку забаставала 4.500 шофэраў-грузчыкаў. Бастуючыя патрабуюць павялічэньня заработку, 8-гадзіннага дня працы і прызнаньня прафсаюза. Між бастуючымі і паліцыяй здарылася сутычка, у выніку якой некалькі чалавек паранена. Да забастоўкі далучыліся і некаторыя штрэйкбрэхеры, якія спачатку замянялі бастуючых. Забаставаўшыя штрэйкбрэхеры таксама патрабуюць павялічэньня заработку. Забастоўка адбіваецца на справах нафтавых таварыстваў «Стандарт Ойль», «Раяль Дэйтч» і інш.

Латвійскія с-д. фашысты грамяць рабочых

РЫГА, 16-X. Адбыўся вялікі мітынг пратэсту супроць намеру фашыстаў разграміць рабочыя больнічныя касы. На мітынгу прысутнічала каля 3-х тысяч рабочых. Выступаўшы на мітынгу старшыня латвійскага цэнтральнага бюро рэфармісцкіх саюзаў сацыял-дэмакрат Вэцкайльс зрабіў шэраг выпадаў супроць новага рабочага руху. Шматтысячная рабочая маса в выгукамі «прэч фашызм» сьцягнула Вэцкальса з трыбуны. Тады сацыял-дэмакратычныя спартсэны пачалі зьбіваць рабочых, прычым 27 чалавек рабочых затрыманы імі і перададзены ў рукі ахранкі. Сходы левых рабочых забаронены ўладаю.

Да зьмены канстытуцыі ў Аўстрыі.

Паправачкі да існуючай „дэмакратыі".

ВЕНА, 16-X. Нацыянальная рада склікаецца 16 кастрычніка. На першых пасяджэньнях будуць пададзены ваканапраэкты аб зьмене канстытуцыі. Мяркуецца пашырэньне паўнамоцтваў прэзыдэнта, якому будзе пададзена права назначаць і звальняць урады, распушчаць парлямант, кіраваць краінай без парляманту і абвяшчаць асаднае становішча. Камунальная камісія ва ўсіх гарадох будзе заменена на агульна-дзяржаўную. Салдаты, дзяржаўныя служачыя і чыгуначнікі пазбаўляюцца права абіраць дзеваранных асоб. Выбарчы ўзрост павялічваецца з 21 да 24 гадоў.

Супроць фашысцкага рэжыму.

ПРАГА, 16-X. Камуніст Капрал які знаходзіцца доўгі час у Кашавускім астрозе, абвясьціў галадоўку, якая цягнецца ўжо другі тыдзень. Кампартыя ў сувязі з гэтым заклікае рабочую клясу Чэхаславакіі пратэставаць супроць фашысцкага рэжыму ў чэхаславацкіх астрогах.

За чыстату шэрагаў Камінтэрну.

Група Чыльбума адхілена ад працы.

СТАКГОЛЬМ, 16-X. 9 кастрычніка адбылося супольнае пасяджэньне палітбюро шведзкай кампартыі з делегацыяй Выканкому Камінтэрну,

У сувязі з адмоваю апартуністычнай групы Чыльбума падначаліцца дырэктывае Выканкому Камінтэрну аб скліку зьезду ў студзені, делегацыя Выканкому Камінтэрну заявіла аб звальненьні з працы да зьезду Чыльбума і ўсіх яго прыхільнікаў.

Група Чыльбума заявіла, што яна не падначальваецца пастанове Выканкому Камінтэрну. Тады прыхільнікі Камінтэрну заявілі аб спыненьні супольнага пасяджэньня з групаю Чыльбума. Пасьля пасяджэньня левая апазіцыя і камсамол заняла памяшканьне ЦК. Даведаўшыся аб гэтым Чыльбум зьвярнуўся да паліцыі з просьбаю ўжыць захады да аховы рэдакцыі і друкарні „Фолькес Тагблят Капітыкен". Рэдакцыя ў сувязі з гэтай заявай вартавалася паліцыяй і шпікамі. Позна ўвечары правыя зрабілі спробу адбіць памяшканьне ЦК, але былі адагнаны. 10 кастрычніка выйшаў першы нумар новага цэнтральнага органу шведзкай кампартыі „За Камінтэрн". Газэта заклікае рабочых згуртавацца пад'ярмо шведзкай сэкцыі Камінтэрну.

У фашысцкай Польшчы.

ППС рыхтуецца да сэсіі сойму.

ВАРШАВА, 15-X. На партыйнай нарадзе ППС ухвалена рэзалюцыя, у якой зазначаецца, што ППС ставіць сабе непасрэдная палітычнай задачай дамагчыся ліквідацыі той сыстэмы кіраўніцтва, якая ўстанавілася ў Польшчы пасьля майскага перавароту 1926 г. і якая абапіраецца на адзіналічную дыктатуру.

Адною з неадкладных задач рэзалюцыя лічыць аб'яднаньне сіл ППС з сіламі іншых сацыялістычных партый і нацыянальных меншасьцяў. Цэнтр цяжкасьці рэзалюцыі заключаецца ў тым яе пункце, дзе гаворыцца, што «кожная спроба дзяржаўнага перавароту спаткае адпор з боку ППС і рабочых мас". Гэтая «рашучая» рэзалюцыя ППС разьлічана на стварэньне адпаведных настрояў напярэдадні надыходзячай сэсіі сойму, а таксама на рэабілітацыю ППС пасьля нядаўніх выкрытых Нісудзкім закулісных махінацый пэнсаўцаў ураду. Не зважаючы на ўсе пагрозы, рэзалюцыя не зрабіла належнага ўражаньня ва ўрадавых колах і спаткана правым друкам з яўнай іроніяй.

Як паведамляе „Наш Пшэглёнд", у адказ на гэтую рэзалюцыю палкоўнік Славэк агалосіць артыкул і выступіць з праграмнай прамовай, у якіх будзе заўважана, што бюджэтная сэсія сойму, якая склікаецца ў канцы кастрычніка, можа зьявіцца апошняй сэсіяй сучаснага сойму, калі апазіцыя адважыцца на сур'ёзнае выступленьне супроць ураду,

Фашысцкі тэрор супроць прафсаюзаў.

ВАРШАВА, 16-X. Зачынен прафсаюз варшаўскіх шкляроў. Зачыненьне прафсаюзу мае сувязь з арыштам 58 металёўцаў, якія нападзілі ў памяшканьні побач з прафсаюзамі нарадуу.

Імпэрыялісты „разбройваюцца".

Францыя згодна ўдзельнічаць у марской канфэрэнцыі але... уносіць свае агаворкі.

ПАРЫЖ, 15-X. У французскім друку ідуць толкі аб тым, што французскі ўрад, згадзіўшыся на канфэрэнцыю 5 дзяржаў, высуне наступныя агаворкі: 1) французскі ўрад заявіць, што ён не згаджаецца нават абмяркоўваць пытаньня аб зьнішчэньні падводных лодак; 2) французскі ўрад будзе патрабаваць, каб у Лёндане абмяркоўваліся „толькі нормы" скарачэньня марскіх сіл в тым, каб лічбы тэннажу былі замацаваны на адной з канфэрэнцый аб разброеньні, якая будзе склікана ў Жэневе Лігаю Нацый. Пры гэтым гэтыя лічбы павінны будуць устанаўляцца ў шчыльнай залежнасьці ад умоў будучай канфэрэнцыі аб разброеньні сухаземнага войска. Увесь буржуазны друк настойвае на недапусьцімасьці ня толькі зьнішчэньня, але і колькі небудзь значнага скарачэньня ліку падводных лодак.

* * *

ЛЁНДАН, 15-10. Італьянскі пасол перадаў міністэрству замежных спраў адказ Італьянскага Ураду, у якім Італія выказвае згоду на ангельскія запросіны ўзяць удзел у марской канфэрэнцыі 5 дзяржаў.

Посьпехі „Страны Советов".

НЬЮ-ЁРК, 16-X. Прыёт самалёту „Страна Советов" у Сытэль значна павялічыў зацікаўленасьць амэрыканскага друку гэтым пералётам. Сёньня «Нью-Ёрк-Таймс» зьмяшчае вялікую перадавіцу, у якой зазначаецца, што прыёт «Страны Советов» у Сытэль выяўляецца выяўленьнем агульнага шырокага і пасьпяховага разьвіцьця авіацыі ў СССР. Таварыства прыяцеляў СССР падаравала ўсім удзельнікам пералёту па трактару.

У Саюзе Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Гутарка сэкратара ЦК УсеКП(б) т. Кагановіча з Луганскай дэлегацыяй

МАСКВА, 14-X. Делегацыя луганскіх рабочых наведала сэкратара ЦК УсеКП(б) тав. Кагановіча. Гутарка цягнулася каля 3-х гадзін.

„Ваш прыезд,—сказаў т. Кагановіч, мае буйнае палітычнае і гаспадарчае значэньне. Чырвоны эшалён луганцаў—дзіця сацыялістычнага спаборніцтва, сацыялістычнага будаўніцтва. Вельмі здаволен, што маю магчымасьць прывітаць у вашай асобе луганскіх рабочых, як перадавых барацьбітоў і будаўнікоў сацыялізму".

Рабочыя ў запытаньнях да т. Кагановіча цікавіліся ходам хлебазагатовак, перспэктывамі забясьпекі Данбасу харчам і прамтаварамі, падрыхтоўкаю тэхнічных кадраў, разьмеркаваньнем пазыкі індустрыялізацыі і г. д.

Тав. Кагановіч у свой чарод цікавіўся настроямі рабочых, узаемаадносінамі партыйцаў з беспартыйнымі, разгортваньнем самакрытыкі ў Луганшчыне, працаю прафсаюзаў і іншымі пытаньнямі. Перадайце пралетарыям Луганшчыны,—сказаў урэшце т. Кагановіч,—што партыя чакае новых посьпехаў у барацьбе за сацыялізм і новых тысяч членаў партыі з перадавых рабочых.

Распушчаны кулацкія калгасы.

НОВАСІБІРСК, 14-X. У Канскай акрузе арыштаван старшыня калгасу «Завіра» Квіткоўская. Калгас адмаўляецца складаць хлебафуражны баланс. Кіраўнікі калгасу—усе кулакі. У мінусінскай акрузе калгас „Красный Пролетарий" распушчан за нядбалае хлеба. Беднота і сераднякі «Красного Пролетария" заснаваць на зямлі „Красного Пролетария" новы калгас.

Эшалён сталі і жалеза.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 15-10. Рабочыя заводу імя Петроўскага пасылаюць Рэвалюцыйнаму Вайсковаму Савету СССР эшалён сталі і жалеза. Трубны цэх заводу імя Леніна бярэ ўдзел у пасылцы эшалёну і выклікае іншыя цэхі свайго заводу, а таксама падшэфную вёску. Для ажыцьцяўленьня эшалёну будзе праведзен нядзельнік. Эшалён прыедзе ў Маскву да ўгодак Кастрычніка.

Бесперапынны тыдзень не парушае заработку

МАСКВА, 11-X. У НК Працы СССР адбылася нарада па пытаньнях аб заработку рабочых і служачых прадпрыемстваў і ўстаноў, якія пераходзяць на бесперапынны вытворчы тыдзень. Нарада рашыла, што пры пераходзе на бесперапынны рабочы тыдзень заработак рабочага і служачага павінен быць пакінут ранейшым.

Сплашная калектывізацыя ахапіла шырокія масы татарскага сялянства.

КАЗАНЬ, 14-X. Сплашная калектывізацыя Тумутуцкай воласьці, Бугульмінскага кантону, праходзіць з вялікім посьпехам. Ужо калектывізавана 57 проц. усіх гаспадарак воласьці. Прыклад гэтай воласьці зрабіў вялікі ўплыў на некалькі суседніх валасьцёў. Так, у Алкеесўскай воласьці калектывізавана 35 проц. гаспадарак, а Сахоўская—таго-ж Бугульмінскага кантону аб'яднала ўжо 72 проц. усіх гаспадарак. Наркамзем распрацоўвае пытаньне аб пераводзе ўсяго кантону ў райён сплашной калектывізацыі. Трэба адзначыць, што пераход на сплашную калектывізацыю ахапіў шырокія масы татарскага сялянства.

1000 руб. на танк імя т. Лепсэ.

ХАРКАЎ, 15-10. Усеукраінскі камітэт саюзу металёўцаў аддыгаваў тысячу руб. на пабудову танку імя тав. Лепсэ.

Абсталяваньне для трактарабудаўніцтва.

РАСТОЎ-ДОН, 15-X. У Новарасейск в Нью-Ёрку прыплыў параход „Эксфорд", які прывёз вялікую партыю імпортнага абсталяваньня для трактарабудаўніцтва, Грознафты і Югасталі. З прыходам «Эксфорду» пачынаюцца рэгулярныя пароходныя зносіны між Злучанымі Штатамі і фортамі Чорнага мора, упяршыню пасьля рэвалюцыі.

Да расстрэлу за забойства старшыні с-с.

ВЯЛІКІ ЎСЬЦЮГ, 14-X. Паўночна-дзьвінскі акруговы суд прыгаварыў да расстрэлу кулака Шаньгіна за забойства старшыні Сямёнаўскага сельсавету т. Міхалёва, які рашуча змагаўся супроць кулацтва.

Кулацкая расправа над селькорам.

ШАПЯТОЎКА, 15-10. У вёсцы Зубаўшчыне, Ганакольскага раёну, забіт актыўны селькор газэты „Шлях Жовтня" Хведар Саўчук. Забойства зьвяўляецца помстаю куланоў за актыўную працу Саўчука ў галіне хлебазагатовак.

Рэарганізацыя сыстэмы кіраўніцтва прамысловасьцю.

МАСКВА, 13-X. Пленум ВСНГ СССР адобрыў тэзісы па рэарганізацыі сыстэмы кіраўніцтва прамысловасьцю. Канчатковае рэдагаваньне па гэтым пытаньні даручана спэцыяльнай камісіі, складзенай гэтымі днямі ў складзе прадстаўнікоў НК РСІ і ВСНГ СССР з прыцягненьнем прадстаўнікоў УЦСПС, Пленум прызнаў неабходным, каб усе пытаньні, зьвязаныя з рэарганізацыяй прамысловасьці, былі ў месячны тэрмін канчаткова прапрацаваны, пераглядзены прэзыдыумам ВСНГ і праведзены праз усе належныя інстанцыі.

3-хтыднёвік калектывізацыі даў сотні новых калгасаў.

ЛЕНІНГРАД, 14-X. У вобласьці скончыўся „3-хтыднёвік калектывізацыі". Арганізаваны і зацьверджаны сотні новых калгасаў розных с-г. каапэрацыйных аб'яднаньняў. У некаторых мясцох праводзіцца сплашная калектывізацыя цэлых райёнаў. Распачата пашырэньне ў паўтары разы абшару калгасаў і павялічэньне аграмаджанага статку ў два разы. Пашыраецца таксама плошча пад гародамі і пад лёнам. 3-хтыднёвік скончыўся „днём ураджаю і калектывізацыі".

Сурова пакараны

вінаўнікі самагубства настаўніцы Івановай

РЖЭЎСК, 13-X. Скончыўся судовы працэс на справе аб самагубстве настаўніцы Младатуцкай школы Івановай. Допыт абвінавачаных і сьведак устанавіў малюнак поўнага развалу партыйнай і савецкай валаснай верхавіны, важыму самакрытыкі, уціску савецкага настаўніцтва з боку контр-рэвалюцыйнай групы настаўнікаў Каралёвых, скажэньня клясавай лініі ў практычнай працы партыйнага і савецкага апарату. Каралёў і Золатаў выкрыты, як актыўныя ўдзельнікі контр-рэвалюцыйнага паўстаньня 1918 году ў Младатуцкай воласьці. Віноўнікаў сьмерці Івановай выязная сэсія абласнога суду засудзіла: Каралёва на 7 гадоў зьняволеньня з суровым адбываньнем і пазбаўленьнем правоў на 3 гады; Золатава—на 3 гады зьняволеньня з пазбаўленьнем правоў на 2 гады; усім гэтым засуджаным забаронена на працягу 5 год жыць у Заходняй вобласьці; Львоў і Пляноўчыкаў засуджаны на 4 гады зьняволеньня з пазбаўленьнем на працягу 2 гадоў права займаць адказныя пасады; Пагосеў—на 2 гады зьняволеньня з пазбаўленьнем правоў на 2 гады; Завялава—на 1 год прымусовай працы, Калініна—на 6 месяцаў. Сакалоў і Талызаў—апраўданы.

Навіны аэра-арктыкі.

ЛЕНІНГРАД, 14-X. З Берліну вярнуўся старшыня магнітнай камісіі аэра-арктыкі Розэ, які езьдзіў туды в делегацыяй СССР на з'езд аэра-арктыкі.

У гутарцы з супрацоўнікам РОСТА Розэ паведаміў: делегацыя СССР на зьезьдзе аэра-арктыкі складалася з 3 сяброў: прафэсара Малчанава, Вінсэ і мяне. Зьезд аэра-арктыкі, галоўным чынам, абмяркоўваў пытаньне аб надыходзячым палёце цэпэліну „Л. Ц. 127" у арктычныя краіны.

Мэта палёту—распрацоўка мэтадаў гэафізычных абсьледаваньняў і спроба лётных якасьцяў карабля ў палярных умовах для выяўленьня магчымасьці выкарыстоўваньня цэпэліну ў якасьці транспартнага сродку пры дастаўках у далёкія паўночныя краіны. Згодна нашых зазначаньняў, Эксэнер прыстасоўвае спэцыяльную каюту ў цэпэліне для ўстаноўкі мэтэаралёгічных прыладаў.

Згодна прапановы савецкай делегацыі Эксэнер выказаў згоду зрабіць у лютым палёт на цэпэліне з Фрыдрыхгафэна ў Маскву і назад. Гэты палёт, у часе якога будуць рабіцца мэтэаралёгічныя дасьледаваньні, павінен зьяўляцца некаторым парадкам генэральнай рэпэтыцыяй будучай арктычнай экспэдыцыі. У гутарцы з прадстаўнікамі савецкай делегацыі Эксэнер выказаў жаль, што мэтэаралёгічныя ўмовы перашкодзілі яму ў часе яго падарожжа навакол сьвету праляцець над Масквою.

ДЫРЭКТЫЎНЫ ЛІСТ ЦСПСБ І ВСНГБ
АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ КАЛДАГАВОРНАЙ КАМПАНІІ.

Усім прафсаюзным арганізацыям і гаспадарчым органам БССР.

ПАВАЖАНЫЯ ТАВАРЫШЫ!

Прадстаячая калдагаворная кампанія будзе працякаць ва ўмовах далейшага росту сацыялістычнага будаўніцтва і шпаркага тэмпу індустрыялізацыі ўсёй народнай гаспадаркі. Мінулы 1928-1929 гаспадарчы год ня гледзячы на няжасьці, якія выцякаюць з умоў нашага бурнага гаспадарчага росту ў тэхнічна-адсталай краіне і наперакор прадказаньням нрава-апартуністычных ухілістаў—даў па асноўным паказьнікам ня толькі выкананьне, але і перавыкананьне плянавых заданьняў. Разам з узмацнёным тэмпам разьвіцьця прамысловасьці і сельскае гаспадаркі адпаведна паляпшаліся матар'яльна-бытавыя ўмовы рабочае клясы. Рост сярэдняй месячнай намінальнай зарплаты па рэспубліканскай прамысловасьці БССР за 1928-29 г., па папярэднім даным складае—11,6 проц. пры росьце вытворчасьці працы за гэты-ж пэрыяд на 21 проц. (па даным ВСНГБ).

Палепшаньне жыцьцёвага ўзроўню рабочае клясы толькі па аднэй рэспубліканскай прамысловасьці дало павялічэньне асыгнаваньняў па фонду палепшаньня быту рабочых да 1.726 тыс руб. (на 742 тыс. больш мінулага году); на жыльлёва-камунальнае будаўніцтва выдаткавана 3.150 тыс. руб. (на 880 тыс. рублёў больш мінулага году); выдаткі на сацыяльнае страхаваньне па прамысловасьці ВСНГБ (за выключэньнем Белдзяржбуду і Лесанарыхтовак) складаюць 5.100 тыс. (на 1 мільён больш мінулага году). На працягу 1928-29 г. пераведзена на 7-мігадзінны рабочы дзень па Беларусі пяць буйных прадпрыёмстваў з колькасьцю паміж рабочых 3.400 чал.

Побач з гэтымі станоўчымі паказальнікамі за мінулы гаспадарчы год ёсьць наступныя недахопы: слабае выкананьне плянавых заданьняў па зьніжэньню сабекошту (за 28-29 г. сабекаштоўнасьць паніжана на 4,5 проц. супроць прадугледжаных па прам. фін. пляну 7 проц.), недастаткова замацавана працоўная дысцыпліна па шэрагу прадпрыёмстваў, слаба яшчэ разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва, ёсьць выпадкі патэрпчаньня якасьці вырабляемай прадукцыі і інш.

Інтарэсы сацыялістычнага будаўніцтва, абароны краіны і здавальненьне ўсё ўзрастаючых запатрабаваньняў рабочае клясы,—патрабуюць яшчэ больш шпаркіх тэмпаў індустрыялізацыі і рэканструкцыі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі на сацыялістычных падставах. У адпаведнасьці з гэтым на 1929-30 г. па кантрольным лічбам прамысловасьці прыняты заданьні якія значна правышаюць намечаны тэмп росту прамысловасьці Беларусі на другі год пяцігодкі, Капітальныя затраты на 1929-30 г. па прамысловасьці ВСНГБ намячаюцца ў разьмеры 52 мільёнаў руб. (па пяцігодцы 37.700.000). Рост валавой прадукцыі па кантрольным лічбам прыняты ў разьмеры 65 проц. (па пяцігодцы прадугледжана 26,1 проц.), сабекаштоўнасьць прадукцыі павінна быць зьніжана на 10 проц.

Выходзячы з гэтых задач і кіруючыся дырэктывамі УсеЦСПС і ВСНГ СССР („Труд", № 224 ад 28-IX—г. г.), ЦСПСБ і ВСНГБ прапануюць:

Асноўныя задачы калдагаворнай кампаніі.

Улічваючы недахопы калдакаворнай кампаніі мінулага году, якія выразіліся ў слабым завастрэньні ўвагі рабочых мас на гаспадарча-палітычных задачах работ клясы ў сувязі з чым у большасьці выпадкаў кампанія прайшла, як вузка практычная задача і канцэнтравала ўвагу рабочых, галоўным чынам, навакол матар'яльна-бытавых пытаньняў—ЦСПСБ і ВСНГБ прапануюць усім профарганізацыям і гаспадарчым органам правесьці калдагаворную кампанію гэтага году, як шырокую гаспадарча-палітычную кампанію. Шырока асьвятляючы перад рабочымі канкрэтныя гаспадарчыя заданьні, якія выцякаюць з нашых кантрольных лічбаў; неабходна сканцэнтраваць увагу рабочых навакол пытаньняў павышэньня вытворчасьці працы, зьніжэньня сабекошту, палепшаньня якасьці прадукцыі, зьніжэньня накладных выдаткаў, мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, узмацненьня працоўнай дысцыпліны і правядзеньня бесперапыннага вытворчага тыдню.

Побач з узмацненьнем работы прафсаюзаў на абароне матар'яльных, бытавых і культурных патрэб рабочых і служачых, злучаючы і зьвязваючы гэтую работу з агульнымі інтарэсамі і задачамі рабочае клясы, уважлівым чынам адносячыся да запатрабаваньняў рабочых,—прафсаюзы і гаспадарчыя органы павінны рашуча змагацца з адсталымі і рвачоскімі настроямі асобных груп рабочых, даваць рашучы бальшавіцкі адпор вылазкам контрэвалюцыйных элемэнтаў, рэшткам трацкізму і праваапартуністычным настроям, апіраючыся ў гэтай барацьбе на перадавыя, актыўныя слаі рабочае клясы.

Прафсаюзы і гаспадарчыя органы павінны шырока растлумачыць рабочым масам, што калдагавор ня толькі зьяўляецца формай рэгуляваньня ўмоў працы рабочых, але ён таксама і зьяўляецца важным рычагом выкананьня гаспадарчага пляну і абаюдным абавязкам, што побач з адказнасьцю гаспадарнікаў за дакладнае выкананьне калдагавору, рабочыя і прафсаюзы з свайго боку бяруць на сябе абавязак выканаць прынятыя заданьні па прам. фін. пляну.

Праверка выкананьня калдагавароў.

У адпаведнасьці з раней дадзенымі дырэктывамі УсеЦСПС і ЦСПСБ, прафарганізацыям неабходна, побач з праверкай фактычнага выкананьня гаспадарчымі органамі дзейнічаючых калдагавораў, праверыць выкананьне ўзятых імі абавязкаў па ахове працы і тэхніцы небясьпекі па дагаварам з органамі НК працы. Побач з гэтым праверачныя брыгады, (якія павінны быць утвораны на падставе пастановы прэзыдыуму ЦСПСБ ад 17-IX 1929 г.) і ФЗМК павінны выкарыстаць маючыяся матэр'ялы праверкі выкананьня гаспадарча-палітычных дагавароў па сац. спаборніцтву з мэтаю зьнішчэньня маючыхся недахопаў і непаладак на вытворчасьці, якія перашкаджаюць разьвіцьцю сацыялістычнага спаборніцтва, улічваючы ўсе дзеловыя прапановы рабочых.

ВСНГБ абавязвае ўсе трэсты і дырэктарыі прадпрыемстваў паставіць свае даклады аб выніках работы прадпрыемстваў і далейшых пэрспэктывах на масавых рабочых сходах, пры гэтым да пастаноўкі гэтых дакладаў гаспадарчыя органы павінны своечасова прадставіць неабходныя матар'ялы ФЗМКомам.

Вытворчасьць працы і зарплата.

Рост намінальнай зарплаты на 1929-30 год вызначан у сярэднім па ўсёй рэспубліканскай прамысловасьці ў разьмеры 8 проц., пры павышэньні вытворчасьці працы на 26,8 проц. Улічваючы нізкі ўзровень зарплаты, які існуе па льно-прадзільнай, шкляной і сярніковай галінам прамысловасьці і значнае адставаньне тэмпу росту іх зарплаты ў параўнаньні з іншымі галінамі, — ВСНГБ па дагаворанасьці з ЦСПСБ адпускае 175 тыс. руб. (у лік 8 проц.) на мэханічнае падцягваньне зарплаты ў гэтых галінах прамысловасьці з наступнага разьліку:

для шкляной прамысловасьці	70000 руб.
для сярніковай „	55000 руб.
для льно-прадзільн. „	50000 руб.

Адпушчаныя сродкі павінны быць скарыстаны за час з 1 студзеня па 1 кастрычніка 1930 г. (9 м-цаў).

Выкарыстаньне адпушчаных сродкаў на мэханічнае падцягваньне зарплаты па собным прадпрыемствам павінна правозіцца па дагаворанасьці паміж трэстамі і адпаведнымі ЦП саюзаў, якія павінны не пазьней 25 кастрычніка разьмеркаваць гэтыя сродкі па асобным прадпрыемствам. Прафсаюзы і гаспадарнікі абавязаны прыняць меры да поўнага выкарыстаньня адпушчаных сум на мэханічнае падцягваньне зарплаты, прычым ніводная старана ня можа прад'яўляць запатрабаваньня аб павялічэньні альбо памяншэньні ўстаноўленых сум, з тым, каб устаноўлены рост намінальнай зарплаты ў 8 проц. ня быў перавышан. У галінах прамысловасьці, для якіх не адпушчаны сродкі на мэханічнае падвышэньне зарплаты, рост гэтакай павінен адбывацца ў разьмеры, які прадугледжаны кантрольнымі лічбамі выключна ў залежнасьці ад павялічэньня інтэнсыўнасьці і падняцьця прадукцыйнасьці працы. Гэта датычыцца і ўсіх прадпрыемстваў мясцовай прамысловасьці і прамкалектываў. У адносінах прамкалектываў, якія ня маюць сваіх прам. фін. пляну, рэгуляваньне зарплаты правозіцца па папярэдняй дагаворнасьці паміж аб'яднаньнем працаляктываў з адпаведным праўленьнем саюзу, узгодненым з АПБ (па Менску з ЦСПСБ).

Зарплата кіраўнічага апарату павінна рэгулявацца ў адпаведнасьці з сумамі, прадугледжанымі па кантрольным лічбам.

Рэальная зарплата.

Асобная ўвага павінна быць зьвернута з боку прафсаюзных і гаспадарчых органаў да пытаньня павышэньня рэальнай зарплаты. Павінны быць прыняты рашучыя меры да поўнага ажыцьяўленьня вызначанага росту рэальнай зарплаты на 1929-30 г. у сярэднім у разьмеры 11 проц. Прафсаюзы павінны рашуча дабівацца правільнай пастаноўкі рабочага снабжэньня, асабліва сельска-гаспад. прадуктамі, аказваючы ўсямернае садзейнічаньне загатоўчым органам у загатоўцы прадуктаў, а таксама наладзіўшы сыстэматычны кантроль усёй рабочай масы і асабліва рабочага актыву за работай спажывецкай каапэрацыі і органаў НК Гандлю.

Тарыфная рэформа.

У прадстаячую калдагаворную кампанію поўнасьцю павінна быць скончана правядзеньне тарыфнай рэформы ў тых галінах прамысловасьці, дзе яна праводзілася у папярэднія годы, але не закончана. У галінах прамысловасьці, для якіх устаноўлен фонд мэханічнага падвышэньня зарплаты, частка сродкаў можа быць скарыстана для канчатковага правядзеньня тарыфнай рэформы. Па астатнім галінам прамысловасьці тарыфная рэформа можа быць праведзена шляхам выкарыстаньня часткі эканоміі па зарплаце, якая атрымаецца ў сувязі з пераглядам норм і расцэнак з такім разьлікам, каб рост зарплаты адпавядаў бы кантрольным лічбам. У адносінах адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу тарыфная рэформа павінна праводзіцца ў рамках фонду зарплаты гэтай групы работнікаў, улічваючы пры гэтым усе віды аплаты, як-та: прэмінальныя, акордныя аплаты і г. д., не дапускаючы выдаткаваньня для гэтай мэты сродкаў з фонду мэханічнага падвышэньня зарплаты.

Неабходна таксама зьнішчыць устаноўленую па многім кал. дагаворам аплату пачасоўшчыкаў па сярэдняму прыработку зьдзельшчыкаў на такіх работах, якія ня маюць прамога ўплыву на павялічэньне прадукцыйнасьці працы зьдзельшчыкаў, устанавіўшы для іх цьвёрдыя аплаты па іх кваліфікацыі.

Нармаваньне працы.

На пастаноўку нармаваньня працы на прадпрыемствах да сучаснага моманту як з боку гаспадарчых органаў, так і проф. арганізацый была зьвернута зусім недастатковая ўвага, у сувязі з чым у гэтай працы ёсьць значныя недахопы.

ВСНГБ і ЦСПСБ прапануе гаспадарчым і праф. органам прыняць рашучыя меры да ўзмацненьня работы ТНБ на прадпрыемствах і ўсямернаму разгортваньню работы па тэхнічнаму нармаваньню. Перагляд і праверка норм выпрацоўкі павінны праводзіцца сыстэматычна на працягу ўсяго году, не выключаючы і пэрыяд калдагаворнай кампаніі. Прафсыяльным і гаспадарчым органам неабходна распрацаваць падрабязны плян і парадак перагляду норм выпрацоўкі па цэхам і асобным групам рабочых, заключаючы для гэтага асобную згоду. Пры пераглядзе норм выпрацоўкі і зьдзельных расцэнак неабходна забясьпечыць выкананьне росту прадукцыйнасьці працы і зарплаты ў разьмеры, прадугледжаным па кантрольным лічбам, аб чым неабходна ўключыць спэцыяльныя пункты ў калдагаворы. Устанаўленьне новых норм і расцэнак павінна праводзіцца на падставе навукова-абгрунтаваных даных, а таксама на падставе вопытных статыстычных даных, калі апошнімі выяўляюцца значныя перапаработкі. Прадугледжаныя нормы выпрацоўкі і зьдзельных расцэнак выпрацоўваюцца на ўвесь год, датэрміновы перагляд норм павінен быць утворан у выпадках правядзеньня арганізацыйных і тэхнічных палепшаньняў маючых уплыў на рост выпрацоўкі рабочых, а таксама ў выпадках устанаўленьня тэхнічным нармаваньнем няправільнасьці існуючых норм.

Улічваючы важнасьць работы па тэхнічнаму нармаваньню ад чаго ў значнай ступені залежыць правільнасьць арганізацыі працы і палепшаньня работы прадпрыемства, ЦСПСБ і ВСНГБ прапануюць усім праф. і гасп. арганізацыям паставіць работу ТНБ у цэнтры сваёй увагі, узмацняючы гэтакія належным кадрам нарміроўшчыкаў.

Праца жанчык і падлеткаў.

У мэтах палепшаньня матар'яльнага і культурнага ўзроўню работніц у надыходзячай калдагаворнай кампаніі неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на падвышэньне вытворчай кваліфікацыі работніц свачасовае і больш гібкае прасоўваньне іх на вышэйшую кваліфікацыю і абслугоўваньне работніц бытавымі ўстановамі.

Улічваючы, што на шэрагу галін вытворчасьці адзначаецца паменшаньне удзельнай вагі жаночае працы, а ў некаторых прадпрыемствах яўнае ці захаванае выцясьненьне жаночае працы,—у прадстаячую калдагаворную кампанію павінна быць завострана ўвага на большым упядрэньні жаночае працы у вытворчасьць.

Побач з працягваньнем лініі па ўцягненьню жанчын-адзіночак у вытворчасьць неабходна таксама ўзяць курс на ўцягненьне ў вытворчасьць жонак рабочых, састаячых на вучоце Біржы Працы.

У галіне рэгуляваньня працы вучняў і падлеткаў неабходна кіравацца наступным

А) У тых галінах прамысловасьці, дзе вызначана мэханічнае падвышэньне зарплаты, павінна быць таксама прадугледжана падцягваньне зарплаты вучняў, у разьмерах, устаноўленых адпаведнымі саюзамі і гасп. органамі пры ўдзеле прадстаўнікоў ЛКСМБ.

Б) Своечасова пераводзіць вучняў з разраду ў разрад, а ў адносінах вучняў апошняга году навучаньня,—прадставіць ім магчымасьць выкананьня зьдзельных работ на роўных падставах з дарослымі рабочымі з даплатай за скарочаны рабочы дзень паміж асноўнай стаўцы, праводзячы гэтыя мерапрыемствы больш рашуча ў адносінах падлеткаў-дзяўчат.

В) Неабходна прадугледзіць у перазаключаемых калдагаворах пытаньні аховы працы, культурна-бытавыя ўмовы вучняў—падлеткаў, а таксама і прыём на работу пераросткаў і дзяцей рабочых, якія састаяць на вучоце Біржы Працы наравне з дарослымі рабочымі—сябрамі саюзу.

ЦСПСБ і ВСНГБ завастраць увагу проф. і гасп. арганізацый на неабходнасьці больш рашучага ўнядрэньня працы падлеткаў-дзяўчат у вытворчасьці. У сувязі з неабходнасьцю давядзеньня ўдзельнае вагі падлеткаў-дзяўчат у вытворчасьці да 50 проц. у адносіне да агульнай колькасьці падлеткаў, — Цэнтральным Праўленьням Саюзаў разам з адпаведнымі трэстамі неабходна вызначыць канкрэтныя прадпрыемствы, дзе гэткія павінны быць павялічаны.

Г) Максымум увагі павінен быць зьвернут пытаньням лепшай пастаноўкі навучаньня падлеткаў, як індывідуальна-брыгадным вучнёўствам, гэтак і школамі ФЗВ.

Праца і зарплата спэцыялістых.

Рэгуляваньне працы і зарплаты спэцыялістых у тых саюзах, дзе праведзена тарыфная рэформа, павінна праводзіцца на падставе тарыфных сетак і па разрадной разьбіўцы, прадугледжваемай тарыфнымі даведчыкам адпаведных саюзаў. Неабходна ў калдагаворах унесьці спэцыяльны разьдзел аб умовах працы і зарплаты спэцыялістых, пры гэтым спэцыялістым павінны быць у максымальнай меры ўцягнуты ў абгаварэньне ня толькі разьдзелу калдагавораў аб спэцыялістых, але і ўсяго дагавору цалкам. Выпадкі самавольнага ўстанаўленьня разьмеру зарплаты асобным спэцыялістым гаспадарнікамі—павінны быць катэгарычна зьнішчаны. У выпадках неабходнасьці запрашэньня высока-кваліфікаваных спэцыялістых з больш павялічанымі акладамі, гасп. органы павінны да пастаноўкі гэтых пытаньняў на зацьвярджаньне органаў НК Працы—узгадняць іх з адпаведнымі прафсаюзамі. Неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на правільнае правядзеньне прэміраваньня тэхнічнага пэрсаналу з тым, каб гэткае праводзілася за сапраўдныя дасягненьні, якія даюць эканамічны эфэкт. Побач з гэтым неабходна рашуча ліквідаваць такія формы праміраваньня, якія носяць характар захаванай формы зарплаты.

Прававыя і бытавыя ўмовы.

У прававой і бытавой частцы калдагавору неабходна захаваць існуючыя нормы, уносячы адпаведныя ўдасканаленьні на падставе маючыхся зьмен у працоўнае заканадаўства (чарговыя водпускі і г. д.). Гэта, аднак, не павінна прывесьці да пагоршаньня снабжэньня рабочых і служачых спэц. вопраткай.

Разьмер адлічэньняў на ўтрыманьне нізавых праф. ячэек і культурна-бытавых устаноў павінен быць таксама захаваны ў разьмеры мінулага году. Па новым дагаворам неабходна прадугледзіць умовы працы, тэрміны пераводу і парадак работы прадпрыемстваў у якіх уводзіцца непарыўны вытворчы тыдзень, побач з гэтым неабходна прыстасаваць абслугоўваньне гэтых рабочых і работніц адпаведнымі культурна-бытавымі ўстановамі (чырв. куткі, ясьлі, дзіцячыя пляцоўкі, ачаті, сталовыя, мэд. пункты і г. д.).

Асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на пытаньні аховы працы, тэхнікі небясьпекі і жыльлёва-камунальнага будаўніцтва. У дагаворах неабходна прадугледзіць па якіх прадпрыемствах праводзяцца тыя ці іншыя мерапрыемствы і ў якія тэрміны павінны быць праведзены мерапрыемствы па тэхніцы небясьпекі і ахове працы, згодна промфінпляну.

Побач з гэтым неабходна прадугледзіць па якім прадпрыёмствам, у якім разьмеры павінна быць разгорнута жыльлёвае будаўніцтва і на якіх прадпрыёмствах павінны быць абсталяваны ясьлі, чырв. куткі, сталовыя, памяшканьні для прыёму харчу, душы, лазьні і г. д. З прычыны маючыхся выпадкаў нескарыстаньня сродкаў ляч. фонду адпушчаемых на арганізацыю ўрачэбных пунктаў на прадпрыемствах у сувязі з адсутнічаньнем памяшканьняў для гэтых пунктаў,—неабходна прадугледзіць па кал. дагаворам абавязковае прадстаўленьне гаспадарчымі органамі неабходных памяшканьняў.

Арганізацыйныя пытаньні.

Не пазьней 1-га лістападу павінна быць скончана работа вылучаных брыгад па праверцы выкананьня дзейнічаючых дагавораў і прыступлена да абгаварэньня вынікаў праверкі і складаньня новых дагавораў. У працягу лістапада м-цу павінна быць праведзена абмеркаваньне праэктаў новых дагавораў.

Не пазьней 20-га сьнежня калдагавары павінны быць падпісаны старанамі і зарэгістраваны ў органах НК Працы з тым, каб у апошніх лічбах сьнежня м-ца новыя калдагавары былі вывешаны ў прадпрыёмствах. Неабходна дабіцца максымальнага палепшаньня пастаноўкі абгаварэньня дагавораў па цэхам, зьменам і на агульна-завадзкіх сходах і канфэрэнцыях уцягваючы пагалоўна ўсіх рабочых у абгаварэньне праэктаў дагавораў. Выпадкі ганебнага заключэньня дагавораў без адпаведнага ўдзелу ў гэтай працы рабочых мас павінны быць катэгарычна зьнішчаны.

Асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на пытаньні правільных і чоткіх фармулёровак асобных пунктаў калдагавораў, улічваючы, што на глебе няправільных фармулёровак ствараюцца зусім непатрэбныя канфлікты.

Пры абгаварэньні дагавораў на масавых сходах, гаспадарнікі павінны прымаць актыўны ўдзел у гэтай працы, асьвятляючы перад рабочымі вынікі работы прадпрыёмства за 1928-29 г. і выторча-фінансавыя пляны на 1929-30 г. У выпадках высоўваньня асобнымі рабочымі непасільных запатрабаваньняў, гасп. органы пры поўнай падтрымцы праф. арганізацый, павінны растлумачыць рабочым, што гэтыя запатрабаваньні зьяўляюцца неажыцьцявімымі. ЦСПСБ і ВСНГБ прапануюць праф. і гасп. органам канчаткова зьнішчыць меўшыя мейсца ў мінулым годзе бюракратычныя ізвярашчэньні гасп. і праф. органамі на мясцох дырэктыў вышэйстаячых органаў, што прывяло да шматлікіх канфліктаў па дробным пытаньням і ўтварала недапусьцімую цеганіну. Разрашэньне спрэчных пытаньняў у парадку прымірыцельна-трацейскага разьбіраецьльства можа і павінна мець мейсца толькі ў выключных выпадках пасьля таго, калі былі выкарыстаны ўсе спосабы ўрэгуляваньня гэтых спрэчных пытаньняў у парадку дагаворанасьці старон.

Надаючы кампаніі па перазаключэньню калдагавароў вялізнае палітычнае і эканамічнае значэньне, прафсаюзы і гасп. органы павінны прылажыць максымум увагі, энэргіі і ініцыятывы да правільнага і своечасовага правядзеньня гэтай работы.

НАМ. СТАРШЫНІ ЦСПСБ РОЗЕН.
НАМ СТАРШЫНІ ВСНГБ БАЛЬ.

Фэльп

Шчырае дзякуй ад сялянскай беднаты.

Як па іншых акругах—мы ня ведаем, а сялянская бедната Меншчыны ўдзень і ноччу сьпіць і толькі і думае, каб падзякаваць за дасканалую працу прадстаўнікоў сваіх акруговых устаноў...

Каб яшчэ, скажам, толькі сяляне з адной вёскі, а то са ўсіх раёнаў, з усіх сельсаветаў шчырае дзякуй нясецца.

Толькі дзіўны народ сялянская бедната Меншчыны. Дзякуюць і так дзякуюць, што аж жах бярэ...

— „Дзякуй", кажуць, а трэба яшчэ, каб іх там з канцэлярый усіх рабоча-сялянскай мятлой яшчэ падзякавалі... Шмат і яшчэ цёплых слоў удзячнасьці нясецца з розных куткоў акругі, але мы лепш спынімся.

Але залішняй удзячнасьцю менскіх працаўнікоў яшчэ сапсуеш—задзяруць нос, а тады не падыходзь...

Вас, чытач, цікавіць,—за што-ж такая «ўдзячнасьць»?

За дапамогу, за хуткую і своечасовую дапамогу беднаце...

У свой час Наркамзем да асеньняй пасеўнай кампаніі адпусьціў для камітэтаў сялянскай узаемадапамогі Меншчыны 4000 пудоў палепшанага насеньня жыта.

Акруговая камісія разьм акруговы інспэктар КСТУ 2 напісаў паперку па раёнах: і так, выкупіце гэта насеньн мяркуйце сярод бядняцкіх га Напісаў, падпісаў і супакоіў.

Праходзіць тыдзень, два, п месяц і раптам—з раёнаў паляцелі. Пішуць раённыя сялянскай узаемадапамогі і ляюць: „ваша распараджэньн малі 20 верасьня, а хто атрымалі—і ня ведаем, што бо асеньняя сяўба ў нас ск скончылася...

Дзе і колькі праваляліся раджэньні" акруговага ін КСТУ, чаму ён своечасова н чыў за выкананьнем свайго раджэньня, мы ня можам ска толькі ён 9-га кастрычніка сэкратарыят акрвыканкому высьветліць вінаватых і пр іх да адказнасьці.

Вінаватага ў фармальных і б тычных адносінах да справ здаецца, таварыш інспэктар ўбачыць у люстэрку, а стрэлач ня варта шукаць.

В. Заі

ТРЭСКІ НА ХВАЛЯХ.

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

... У Сілкіна вочы—Фур'е, барада Талстога, сарочка—Галубка і Картуў —салдата японскай вайны, а саё ён увесь—з ног да галавы—загадчык гаспадарчай часткай калгасу „Камунар Магілеўшчыны"--дырэктар вялікай сельска-гаспадарчай фабрыкі.

— Прав дзесяць год не пазнаеце нас.

— Будзе як у вас там, у сталіцы...

— Толькі машын няма... Людзей вуцоных не хапае.

І, не чакаючы адказу, запытваецца:

— Ці дапамогуць нам? Ці прышлюць трактараў і аграномаў?

.... Мы едзем на цагельны завод калгасу „Ленінскі Шлях" і слухаем сакратара парт'ячэйкі Грыневіча:

— Гэта—дробязь, і казаць аб іх амаль што ня трэба, але яны для нас адыгрываюць вялікую ролю.

— Адсутнасьць машын і тэхнічнага пэрсаналу—ня дробязь:

— Я не аб гэтым. Я хачу расказаць вам аб Белкалгассаюзе. Запатрабаваўся нам новы рухавік для млына. Паслалі запытаньне. Чакаем. Тыдзень. Другі. І да гэтага часу. А вось другі выпадак. Прыслалі снопавязалку. —Будзем малацьбу жаць і жнэны вязаць,—казалі калгасьнікі. Але Белкалгассаюз ня даў шпагату. Так і стаяла ў бязьдзейнічаньні машына. Колькі раз прасілі, але маўчаць ні жывыя, ні мёртвыя!

І Грыневіч абураецца на бюракратаў-чыноўнікаў, людзей папяровай дзяржавы.

Што-ж маглі мы яму сказаць апроч таго, чым ён скончыў?

... Цёмна і холадна па-асеньняму. Ні ў воднай хаце няма агню. Калгас сьпіць. Соскін схаваўся ў каўнер і і кішэні паліто:

— Ядрана.

— Ядрана і ня зусім машынна,—дадае селянін,—толькі два трактары на раён.

— І два аграномы — бясплатная прэмія да машын.

— Дрэнна.

— Яшчэ горш.

— А можна-б было як-небудзь нячасьцю дапамагчы.

— Як?

І селянін расказвае, што ў камуне К. Лібкнехта (Быхаўскі раён) ёсьць тры трактары на 250 гэктараў зямлі.

— Прасілі Магілеўскі Ка перадаць адзін нам—адмовілі.

— Мы ў іх не адымаем,— м кі свой патрабавалі.

— Як свой?

— Выпісалі нам, а потым з чынам перадалі ў Быхаўшчыну ён там амаль што і не патрэб

— Ваду з калодзежа цягаюц тарам.

— Праўда?

— Як не недарэчна, але сьцьвярджае Соскін.

... У пакойчыку, што завецца ветам, знаходзіцца чалавек пяц гасьнікаў „Ленінскага шляху". шыня калгасу дае інфармацыю гучых справах».

— Да нас прыяжджае вельмі сялян для азнаямленьня з жы „камуніі". Мы іх водзім па будынках, паказваем ураджаі і ны. Прыяжджаюць таксама многа ных працаўнікоў: з Наркамзему, калгассаюзу, Агракалгассаюзу.

Мы ім таксама паказв выкі сваёй працы. Сяляне, кал рочваюцца дамоў, арганізоўваюць гасы, а адказны працаўнік—м ку, хоць-бы слова аб нас! Х чым колечы дапамаглі! Абяцаюць мерапрыемствы, а на самай спр чым не дапамагаюць. Вось і гас чага пляну няма. І ня толькі ў нас ў „Камунары Магілеўшчыны", шавіку" і іншых.

У Клімавіцкім раёне ўсё па кавана задачы калектывізацыі. З це ў райком партыі, райвыкам іншыя ўстановы—і вы ўсюды ін тыўна пачуеце дух калгасу. Уся сфэра працята аднэй мэтай—

— Суцэльная калектывізацыя.

Ці так у вышэйшых органах? ты кажуць зусім не ў карысьць ючых цэнтраў.

Апарат наш бюракратычны ў аснове, глухі і мёртвы ў цэлай с ме; ён адстае ад тэмпаў жыцьця ба ня толькі ачышчацца ад чы каў (ня кажучы ўжо аб ўлю жых элемэнтах), але разам з гэ перабудаваць усю сыстэму—ад с вету да Наркамату.

Цім. Зарэч

Аб посьпехах і слабых вучастках работы сярод беднаты.

АБ РОЛІ БЕДНАТЫ Ў САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ.

Рэканструкцыйны пэрыяд ня толькі асобна падкрэсьлівае ўсю важнасьць работы з беднатой, але і дае новыя ўстаноўкі ў гэтай рабоце. Калі, напрыклад, тры-чатыры гады таму назад партыя рабіла ўпор на ўзмацненьне палітычных пазіцый беднаты ў вёсцы і замацаваньне бядняцка-сераднядкага блёку (у саветах, каапэрацыі і інш.), дык зараз побач з гэтым падкрэсьліваецца і буйнейшая роля беднаты ў **вытворчай перабудове** сельскае гаспадаркі.

На цяперашнім этапе разьвіцьця раёвалюцыі зазначэньне „бедната—апора партыі ў вёсцы" трэба разумець ня толькі ў тым сэнсе, што бедната зьяўляецца палітычнай апорай партыі ў вёсцы ў органах улады (у саветах і іншых грамадзка-палітычных арганізацыях), але што побач з гэтым бедната робіцца ўсё больш **апорай і ў вытворчай рэвалюцыі** ў сельскай гаспадарцы. І гэта набывае вялізарнае прынцыповае значэньне ва ўсёй нашай пастаноўцы пытаньня аб працы ў вёсцы.

Параўнальна кароткі тэрмін з часу XV зьезду партыі відавочна паказаў, што бедната на справе можа быць і павінна быць асноўнай рухаючай сілай вялікага рэвалюцыйнага працесу перабудовы вытворчых сіл вёскі. Нябываае разьвіцьцё калгаснага руху, у авангардзе якога ідзе бедната, цалкам узмацняе ўсё **ўзрастаючую вытворчую ролю беднаты і яе раёвалюцыянізуючы пачатак у разьвіцьці**, вытворчых сіл вёскі. У сапраўднай рэвалюцыі, якая адбываецца на нашых вачох у вёсцы, бедната ўжо займае авангардныя пазіцыі.

У сувязі з гэтым новым зьявішчам руйнуецца ўсялякае прадстаўленьне і разважаньне аб беднаце, як аб «гульгаёх», або як аб тормазе разьвіцьця вытворчых сіл, аб беднаце, якая ня можа існаваць без „сабезаўскіх" форм дапамогі. Дыялектыка жыцьця паказвае, што бедната ня толькі не зьяўляецца тормазам у разьвіцьці вытворчых сіл, а наадварот, выступае ў авангардзе рэвалюцыйнага перавароту ў сельска-гаспадарчай вытворчасьці.

У гэтай-жа сувязі цікава прасачыць пазіцыю правых. Правыя апартуністы не зразумелі і не разумеюць як раз таго новага, што адбываецца ў вёсцы, г. зн. перадавой ролі беднаты ў рэвалюцыйным перавароце ў сельска-гаспадарчай вытворчасьці.

Для правых выключаюцца тое, што бедната можа адыгрываць важнейшую вытворчую ролю ў рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Адгэтуль у ідэалёгіі правых, як і ва ўсёй іх пазіцыі, яскрава праступае **недаацэнка беднаты і забыцьцё яе ролі**, як палітычнага і эканамічнага фактару ў разьвіцьці вёскі. Не выпадкова правыя і на даным этапе разьвіцьця працягваюць выстаўляць лёзунг «саюз з усім сялянствам», тым самым замазваючы сацыяльна-клясавыя супярэчнасьці вёскі.

Гэткім чынам, правыя не зразумелі і не разумеюць як палітычнай, так і вытворчай ролі беднаты, не зразумелі і не разумеюць дыялектыкі сучаснага разьвіцьця вёскі.

У сувязі з рэвалюцыянізуючай роллю беднаты ў сельскай гаспадарцы цікава прасачыць і пазіцыю выступаўшых прадстаўнікоў «левага загібу». Як вядома, т. Кастроў выступіў з прапановай аб утварэньні «шырокай масавай арганізацыі беднаты ў вёсцы» ў процівагу тым формам арганізацыі работы сярод беднаты, якія праводзіць партыя. Гэта прапанова тав. Кастрова небясьпечна ня толькі тым, што яна захоўвае за сабой прапаганду ідэй сялянскага саюзу, што яна цягне палітычна да адрыву беднаты ад пралетарыяту, але яна шкодна і тым, што ў распачатай рэвалюцыі ў сельска-гаспадарчай вытворчасьці гэта прапанова (калі яе ажыцьцёвіць) адарве бядняцкія масы ад серадняцкіх, ня будзе спрыяць уцягненьню серадняцкіх мас у сацыялістычную рэканструкцыю вёскі.

Гэта «левая» на словах прапанова „пахне" двойчы правымі справамі. Гэта прапанова бязумоўна знаходзіцца на адным стыку з разважаньнямі правых аб тым, што калгасы патрэбны толькі для беднаты, а серадняк абыйдзецца і біз іх. Прапанова Кастрова, як і разважаньні правых, таксама характарызуюць недаацэнку ролі беднаты, яе новай **вытворчай ролі**.

ПАСЬЛЯ XV ЗЬЕЗДУ ЗРОБЛЕН ВЯЛІКІ КРОК НАПЕРАД У РАБОЦЕ З БЕДНАТОЙ.

XV зьезд партыі ў сваіх рашэньнях аддаў вялікую ўвагу рабоце сярод беднаты, даўшы шэраг прынцыповых дырэктыў і практычных прапаноў у гэтай галіне.

Як абстаіць справа з выкананьнем рашэньняў XV зьезду адносна беднаты? За мінулыя паўтара гады з часу XV зьезду **партыя зрабіла вялікі крок наперад у галінё работы з беднатой.**

Бядняцка - серадняцкая гаспадарка ўступіла на шырокі **сацыялістычны шлях разьвіцьця.** У сваім разьвіцьці бядняцка-серадняцкая гаспадарка ў ўмовах пралетарскай дыктатуры пераступае капіталістычны шлях, звычайны для капіталістычных краін, і ў гэтым заключаецца ўся глыбіня прынцыповай розьніцы ў разьвіцьці сельскае гаспадаркі пры дыктатуры пралетарыяту і пры капіталізьме, аб якой гаварыў Ленін.

І самае важнае ў разьвіцьці вёскі складаецца ў тым, што тэмп пераходу яе на вышэйшую ступень надзвычайна высокі. Тут сказваецца той своечасовы і правільны прагноз, які быў дан XV зьездам, і цалком пацьвярджаецца курс на калектывізацыю вёскі, намечаны XV зьездам партыі.

У кампаніх мінулага і бягучага году клясавая барацьба ў вёсцы была больш аголена, чымся 2-3 годы таму назад. На падставе хлебазагатоўчай кампаніі бедната ня толькі павысіла сваю палітычную актыўнасьць, ня толькі мацней зьлілася навакол мерапрыёмстваў партыі, але і набыла больш багаты тактычны вопыт з кулаком.

Не апошняе месца ў дасягненьнях па рабоце з беднатой з часу XV зьезду займае факт узм

...астанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

...ра рэарганізацыю акругова-раённай сыстэмы кіраўніцтва Віцебскай вопытна-паказальнай акругі.

...я спрашчэньня і ...неньня савецкага ...ату, набліжэньня яго да мас, рашучага ...шэньня яго работы, для ажыцьцяў...ня мерапрыемстваў, якія выцякаюць ...каскоранага тэмпу індустрыялізацыі ...рацыялістычнай перабудовы сельскай ...дэркі, рашучай барацьбы з усялякага ...бюрократычнымі скажэньнямі і боль...ўцягненьня шырокіх мас працоўных ...боту саветаў, Цэнтральны Выканаўчы ...тэт і Савет Народных Камісараў БССР ...ганяўляюць: — — —

...Прызнаць метазгодным правядзеньне, ...ньту, у Віцебскай акрузе рэарганізацыю акругова-раённай сыстэмы кіраўніцтва праз перадачу значнай часткі ...ацыйных функцый, якія выконваюцца ...говым апаратам, раённым выканаўчым ...тэтам і Гарсавету, а тых, што вы...ваюцца раённым апаратам — сельскім ...стачковым саветам і гарадзкім саветам ...руговых гарадоў.

...у сувязі з скарачэньнем аперацыйных ...цый Акруговага Выканаўчага Камітэту ...ніць работу Выканаўчага Камітэту ...о Прэзыдыуму па плянаваню, гаспадар...ю (прамысловасьць, сельская гаспадарка, ...аль, фінансы і да т. п.), калітычнаму, культурнаму і арганізацыйнаму кіраўніцтву дзейнасьцю раённых выканаўчых камітэтаў і Гарадзкога Савету, знарачаючы ўсю ўвагу на пытаньні плянаваньня, кантролю і жывога інструктажу за нізавымі звэньнямі апарату.

Узмоцніць значэньне раённых выканаўчых камітэтаў, гарадзкіх, сельскіх і местачковых саветаў праз пашырэньне іх правоў, устанаўленьне матарыяльнай базы для пасьпяховай работы, перабудову апарату, узмацненьне кадраў работнікаў і палепшаньне іх матарыяльнага становішча.

Значная частка акруговых працаўнікоў павінна перайсьці на адміністрацыйную, гаспадарчую і культурную работу ў раёны.

Апарат Акруговага Выканаўчага Камітэту, гарадзкіх саветаў і раённых выканаўчых камітэтаў набудаваць на прынцыпу адказных выканаўцаў без якіх-небудзь структурных надзелаў з палячэньнем правоў і кампетэнцыі непасрэднага выканаўцы і з ускладаньнем на яго поўнай адказнасьці за даручаную яму працу.

У сувязі з названым вышэй правесьці наступныя змены ў функцыях і правах пасобных звэньняў улады на галізах працы савецкага апарату.

...у галіне плянаваньня і статыстычнай працы.

...аб сьпыніць існуючую адарванасьць орга...рэгістрацыі і падліку зьявішчаў у галіне ...ўнай гаспадаркі і сацыяльна-культур...ы будаўніцтва (дзяржаўная статыстыка) ...органаў плянаваньня, для лепшага ска...ваньня прадукцыі дзяржаўнай статы...ці, для мэт абслугоўваньня мясцовых ...ваў і пагашбленага вытрачэньня эко...кі раёну і акругі ў цэлым, а таксама ...арганічнай увязкі ўсяе падзічальнай ...ізнавай працы ў акрузе,—увесьці ў ...ктуру плянаў і статыстычных органаў ...кі наступныя зьмены:

...) устанавіць ва ўсіх сельскіх саветах ...ругі пасады рахункаводаў-статыстыкаў ...сельскіх саветах;

...) ускласьці на плянава-статыстычных ...даўнікоў Акруговага Выканаўчага Камітэту, Гарсавету, раённых выканаўчых камітэтаў вядзеньне ўсяе аперацыйнае статыстыкі і справаздачнасьці (апроч бухгальтарскіх), аддзелаў, што ліквідуюцца, і інспэктыраў Акруговага Выканаўчага Камітэту ...ліна, што рэарганізуюцца, а па рахун...даў-статыстыкаў сельскіх саветаў і ...ньне бухгальтэрскай справаздачнасьці;

...) пакласьці ў аснову працы плянава-...ыстычных работ Акруговага Выканаўчага ...тэту працаўную пытаньня на галінах і ...ах, ажыцьцяўляючы арганічную ўвязку ...ы адказных выканаўцаў (функцыяна...) па статыстыцы і плянаваньню на толькі ...скарэньне матарыялаў падліку, ...і галоўным чынам, праз калегіяльную ...ніцы ўсклясьці на раённыя выканаўчыя камітэты і Гарадзкі Савет.

6. Працу па ахове здароўя дзяцей, фізкультуры, сярод піянэраў і інш. на гораду ўсклясьці на дзіцячы дыспансэр, на яго-ж усклясьці доктарскі кантроль над фізычным выхаваньнем насельніцтва. У раённай, дзе няма пункту аховы здароўя дзяцей і фізкультуры, работу гэту ўсклясьці на раённых санітарных дактароў.

7. Усю гаспадарчую работу, будаўніцтва і рамонты, пытаньні плянавага задавальненьня харчамі, спэцыяльным інвэнтаром і абсталяваньнем, а таксама і рэгуляваньне задавальненьня медыкамэнтамі перадаць непасрэдна ў раёны—раённым выканаўчым камітэтам, а ў горадзе—Гарадзкому Савету.

8. Непасрэдную пасылку на спэцыяльнае лячэньне ў межах БССР, калі такога няма ў акрузе, усклясьці на раённыя, гарадзкія лекавыя ўстановы, а пасылку ў іншыя цэнтральныя гарады СССР усклясьці на лекавыя ўстановы акруговага значэньня, якія знаходзяцца ў веданьні Віцебскага Гарадзкога Савету.

9. Выдачу пратэзаў (зубы, акуляры, бандажы і інш.) рабіць праз раённыя, гарадзкія лекавыя ўстановы.

10. Патранаж над душэўна-хворымі перадаць адпаведным лекавым установам, усклаўшы на іх і ўсю перапіску па пытаньнях апекі.

11. Адбор у санаторыі і на курорты ўсклясьці ў горадзе на адпаведныя лекавыя ўстановы, а ў раёнах—па раённыя больніцы.

II. У галіне фінансава-падатковай.

НА АКРУГОВЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ ГАЛІНЕ ФІНАНСАВА-ПАДАТКОВАЙ УСКЛАДАЕЦЦА:

ПА ДЗЯРЖАЎНЫМ І МЯСЦОВЫМ ПАДАТКАХ.

...) Зацьверджаньне распрацаваных Падатковай інспэкцыяй нарматыўных паказчыкаў;

...) разгледжаньне ў касацыйным парадку ...ргаў на абкладаньне дзяржаўнымі прос...кі падаткамі;

...) правядзеньне аперацыйных аналізаў аб ...ходжаньні падатковых кампаній і нярэ...ае накіраньне іх у НКФ.

ПА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАМУ ...АТКУ І САМААБКЛАДАНЬНЮ.

...) Распрацоўка норм прыбытковасьці для ...ваў і ўстанаўленьне спагнаньня падаткаў ...раёнах;

...) разгляд у парадку нагляду скаргаў на ...аданьне сельска-гаспадарчым падаткам, ...жэньне гаспадарак да ліку тых, што ...ладаюцца ў індывідуальным парадку, ...ацягненьне да самаабкладаньня і на ня...вільнае вылічэньне апошняга;

...) аналіз правядзеньня кампаніі на сель...гаспадарчаму падатку.

...І. ПА МЯСЦОВАМУ БЮДЖЭТУ.

...) Складаньне кантрольных лічбаў пры...каў і выдатку на мясцоваму бюджэту ...разьмеркаваньне датацый па асобных ...ктах;

...) падзік разасыгнаваньня крэдытаў пра...віць агульнымі сумамі, у межах зацьвер...жанага каштарысу, без паказаньня ...ктарысных падзяленьняў;

...) складаньне і падача ў НКФ пакварта...ьна справаздач па прыбытках і выдатках ...цовага бюджэту па разьделах, а гадовае ...ваздачы—па ўстаноўленых формах.

ПА НЕПАДАТКОВЫХ ПРЫБЫТКАХ.

...) Падрыхтоўка матарыялаў для прыбы...вай часткі бюджэту ад непадатковых па...леньняў на мясцовай прамысловасьці;

...) разгляд праекту фінансаваньня мясцо...й прамысловасьці і ўстанаўленьне ліміту;

...) падзік ясное плошчы, разрахунак з ...нікамі лесу.

НА ВІЦЕБСКІ ГАРАДЗКІ САВЕТ У ГА...НЕ ФІНАНСАВА-ПАДАТКОВАЙ УСКЛА...ДАЕЦЦА.

...ПА ДЗЯРЖАЎНЫХ І МЯСЦОВЫХ ПАДАТКАХ.

...) Абкладаньне праз падатковую інспэк...ю дзяржаўнымі простымі і мясцовымі ...адаткамі на тэрыторыі г. Віцебску; абкла...даньне дзяржаўных, каперацыйных і гра...дзкіх арганізацый на тэрыторыі Акругі ...цэнтралізаваным парадку; узысканьне па...ку на тэрыторыі гораду;

...) увядзеньне на тэрыторыі гораду мясцо...іх падаткаў і збораў, устанаўленьне ставак ...рмінаў уплаты;

...) абкладаньне падаткамі робіцца інспэк...рам асабіста. Кн жа асабіста вызначае ...ьмеры авансаў і накладае штраф на ...ратаколах аб парушэньні прамысловага па...ку, за непадачу або за несвачасовую ...дачу сьпісаў на форме № 1 і дэкларацый, ...непадачу зьвестак дамаўласьнікамі аб ...ебах, што займаюцца гандлем або про...сламі ў іх дамох, за невядзеньне або ...правільнае вядзеньне гандлёвых кніг;

...) скаргі на неправільнае абкладаньне ...дзяржаўнымі і мясцовымі падаткамі і нак...ладаньне штрафаў падаюцца праз інспэктара ...разглядваюцца сумесна з яго заключэньнем камісіяй пры Гарадзкім Савеце ў складзе: члена Прэзыдыуму Гарадзкога Савету двух прадстаўнікоў ад спажывецкай і пра...мысловай каперацыі;

...) зацьверджаньне сьпісаў забранага за ...доўжкі маемасьці дзяржаўных і каперацыйных арганізацый і продаж яе з таргоў ...ебіцца Гарадзкім Саветам, а прыватных ...себ і арганізацый—інспэктарам асабіста.

2. ПА МЯСЦОВАМУ БЮДЖЭТУ.

а) Перадаць гарадзкому бюджэту, апроч ...ерэлічаных у Палажэньні пра мясцовы фінансы прыбыткаў, прыбыткі ад мясцовых ...прадпрыемстваў, што знаходзяцца на тэры...торыі г. Віцебску, а па выдатках цэнтралі...заваць на гарадзкім бюджэце мясцовыя ...становы;

б) складаньне кантрольных лічбаў пры...бытку і выдатку гарадзкога бюджэту і сама...га бюджэту;

в) падзік разасыгнаваньня крэдытаў ...равоздіць агульнымі сумамі, у межах зацьвер...жанага каштарысу, без паказаньня ...каштарысных падзяленьняў;

г) складаньне і падача ў цэнтральную ...бухгальтарыю Акруговага Выканаўчага Ка...мітэту справаздач і балянсаў па мясцоваму (гарадзкому) бюджэту.

3. Па непадатковых прыбытках—даць права спагнаць камунальныя прыбыткі ў бясспрэчным парадку.

В. У РАЁННЫХ ВЫКАН. КАМІТЭТАХ У ГАЛІНЕ ФІНАНСАВА-ПАДАТКОВАЙ ПРАЦЫ ПРАВЕСЬЦІ НАСТУПНЫЯ ЗЬМЕНЫ:

1. ПА ДЗЯРЖАЎНЫХ І МЯСЦОВЫХ ПАДАТКАХ.

а) Мяшаныя інспэктарскія падатковыя вучасткі ліквідаваць і ўсю работу па простых і ўскосных падатках усклясьці на РВК у асобе інспэктара;

б) усклясьці на інспэктара РВК асабістае: 1) абкладаньне фізычных і юрыдычных асоб на тэрыторыі раёну дзяржаўнымі простымі (апроч сельгаспадатку) і мясцовымі падаткамі, 2) вызначэньне разьмеру авансаў і штрафаў па пратаколах аб парушэньні Палажэньня пра прамысловы падатак, за непадачу або несвачасовую падачу сьпісаў на форме № 1 і дэкларацый, за непадачу зьвестак дамаўласьнікамі аб асобах, якія займаюцца гандлем або промыслам у іх дамох, за невядзеньне або неправільнае вядзеньне гандлёвых кніг;

в) скаргі на неправільнае абкладаньне дзяржаўнымі і мясцовымі падаткамі і на накладаньне штрафаў падаюцца інспэктару і разглядаюцца сумесна з яго заключэньнем Камісіяй пад старшынствам члена Прэзыдыуму раённага выканаўчага камітэту і ў складзе двух членаў—прадстаўнікоў ад прамысловай і спажывецкай каперацыі;

г) усклясьці на прэзыдыум раённага выканаўчага камітэту:

1) канчатковае вырашэньне спраў па спадчынах і на парушэньнях аб гэрбавым аборы, якія адбыліся на тэрыторыі раёну;

2) зацьверджаньне сьпісаў маемасьці дзяржаўных і каперацыйных арганізацый, якія складзены на спагнаньнях нядоімак па падатках, зацьверджаньне-ж сьпісаў прыватных асоб і арганізацый праводзіцца інспэктарам асабіста;

3) зварот і залік неправільна або зверх патрабы паступіўшых сум, канчатковае і ўмоўнае зьняцьце безнадзейных нядоімак, дача адтэрміноваваньняў і растэрміноваваньняў платы падаткаў; зварот і залік дзяржаўных прыбыткаў на ўсялякую суму і зьняцьця безнадзейных нядоімак на землеўпарадкаваньню;

4) выданьне настаноў аб увядзеньні мясцовых падаткаў, разьмеры іх ставак і тэрмінаў уплаты;

д) складаньне рахункаводзтва вядзецца касай, якая выконвае раённы бюджэт.

2. ПА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАМУ ПАДАТКУ І САМААБКЛАДНЬНЮ.

а) Канчатковае зацьверджаньне норм прыбытковасьці для сельскіх саветаў і пасяленьняў;

б) устанаўленьне тэрміну ўплаты сельска-гаспадарчага падатку для сельскіх саветаў;

в) канчатковае вырашэньне скарг плацельшчыкаў сельскагаспадарчага падатку на пастановы сельскай падатковай камісіі аб неправільным абкладаньні і скарг аб неправільным штрафаваньні за ўкрыцьцё аб'ектаў абкладаньня. Разгледжаньне ў якасьці другой інстанцыі скарг на прыцягненьне да самаабкладаньня або неправільнае вызначэньне яго разьмеру;

г) падзік савецкіх гаспадарак і складаньне для іх закладных лістоў.

3. ПА МЯСЦОВАМУ БЮДЖЭТУ.

а) Касавае выканаьне раённага бюджэту перадаць сельскагаспадарчым крэдытным таварыствам, у зьвязку з чым раённыя касы ліквідаваць;

б) дэтальны падзік крэдытаў па ўстановах раённага значэньня ўсклясьці на гэтыя ўстановы;

в) падзік разасыгнаваньня крэдытаў праводзіць агульнымі сумамі, у межах зацьверджанага каштарысу, без паказаньня каштарысных падзяленьняў;

г) на РВК усклясьціца складаньне і падача ў цэнтральную бухгальтэрыю Акруговага Выканаўчага Камітэту справаздач і балянсаў па мясцоваму (раённаму) бюджэту.

4. ПА НЕПАДАТКОВЫХ ПРЫБЫТКАХ.

а) Зацьверджаньне прамфінплянаў прадпрыемстваў раённага і сельскага значэньня, якія знаходзяцца на гаспадарчым разрахунку;

б) разьмеркаваньне прыбыткаў прадпрыемстваў раённага значэньня;

в) праверка правільнасьці складаньня справаздач і балянсаў установамі раённага і сельскага значэньня, што знаходзяцца на гаспадарчым разрахунку;

г) зацьверджаньне статутаў прадпрыемстваў раённага і сельскага значэньня, якія знаходзяцца на гаспадарчым разрахунку.

Г. НА СЕЛЬСКІЯ САВЕТЫ Ў ГАЛІНЕ ФІНАНСАВА-ПАДАТКОВАЙ УСКЛАДАЕЦЦА

1. ПА ДЗЯРЖАЎНЫХ І МЯСЦОВЫХ ПАДАТКАХ.

б) спагнаньне нядоімак па ўсіх падатках з плятнікаў, якія жывуць на тэрыторыі сельскага савету;

в) складаньне пратаколаў на ўсіх парушэньнях палажэньняў аб дзяржаўных простых і ўносных падатках і накіраваньне іх для вырашэньня ў раённы выканаўчы камітэт.

2. ПА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАМУ ПАДАТКУ І САМААБКЛАДАНЬНЮ.

а) Вылічэньне на нормах прыбыткаў плятнікаў;

б) канчатковае ўстанаўленьне прыбыткаў ад неземляробчых заработкаў, за выключэньнем гаспадарак, што абкладаюцца ў індывідуальным парадку;

в) налічэньне акладу падатку і дача плятнікам льгот;

г) адбор бядняцкіх гаспадарак, якія падлягаюць вызваленьню ад сельскагаспадарчага падатку;

д) запаўненьне і выдача акладных лістоў плятнікам;

е) ужываньне мер прымусовага спагнаньня падатку і зацьверджаньне сьпісаў рухомае маемасьці плятнікаў;

ж) вырашэньне скарг плятнікаў на няправільнае вылічэньне акладу падатку падатковымі камісіямі пры сельскіх саветах;

з) накладаньне штрафаў за ўкрыцьцё ад падліку аб'ектаў абкладаньня;

і) разгледжаньне хадайніцтваў аб зварОце і заліку пераплат;

к) сельска-гаспадарчы падатак прымаецца касамі, якія выконваюць бюджэт сельскага бюджэту або раённага выканаўчага камітэту. Яны-ж вядуць падлік і справаздачнасьць паступленьня сельскагаспадарчага падатку;

л) разгледжаньне ў якасьці першай інстанцыі скарг на ізаляцыйныя мерапрыемствы, так і па асоб, якія абавязаны даваць статыстычныя і справаздачныя зьвесткі;

м) спагнаньне пазыкаў па землеўпарадкаваньню.

3. ПА МЯСЦОВАМУ БЮДЖЭТУ.

а) Па ўсіх сельскіх саветах Акругі увесьці самастойныя сельскія бюджэты;

б) перадаць сельскаму бюджэту ўтрыманьне ўсіх мясцовых устаноў сельскага значэньня;

в) касавае выканаьне сельскага бюджэту ўсклясьці на апчадныя касы, сельскагаспадарчыя крэдытныя таварыствы. Тыя сельскія саветы, на тэрыторыі якіх няма гэтых устаноў, прымадаюць да бліжэйшых апчадных кас і сельскагаспадарчых таварыстваў;

г) дэтальны падзік крэдытаў устаноў, што знаходзяцца на сельскім і местачковым бюджэце, ажыцьцяўляецца сельскім і местачковымі саветамі.

Д. ПРА ПАРАДАК РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫК:

1. Рэалізацыя пазык усклядаецца на раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы;

2. Справаздачнасьць па рэалізацыі пазык перадаць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам, а агульную сводку па Акрузе—Акруговаму Выканаўчаму Камітэту.

3. Усклясьці на Акруговы Выканаўчы Камітэт распрацоўку кантрольных лічбаў па рэалізацыі пазык.

Е. ПРА ПАРАДАК ПАДЛІКУ І ВЫКАНАНЬНЕ ДЗЯРЖАЎНАГА БЮДЖЭТУ

1. Прапрацоўку, дачу заключэньняў і нагляд за складаньнем і выкананьнем кашторысаў устаноў, што знаходзяцца на тэрыторыі г. Віцебску і раёнаў Акругі, якія знаходзяцца на дзяржаўным бюджэце, перадаць на належнасьці Віцебскаму Гарадзкому Савету і Акруговаму Выканаўчаму Камітэту.

2. Зварот і залік дзяржаўных даходаў, без абмяжаваньня сумы, усклясьці на Акруговы Выканаўчы Камітэт, Гарадзкі Савет і раённыя выканаўчыя камітэты на належнасьці.

3. Дэтальны падзік выдаткаў па дзяржаўнаму бюджэту ўсклясьці на належныя народныя камісарыяты.

Ж. НА ДЗЯРЖБАНК УСКЛАДАЕЦЦА:

1. Агульны падзік і складаньне касавай справаздачнасьці па даходах і выдатках дзяржбюджэту, а таксама распараджэньне гэрбавай маемасьці.

2. Акладнае рахункаводзтва па гор. Віцебску.

3. Справы на падліку і спагнаньню страт дзяржавы ад памыловых падлікаў, крадзежу і інш.

4. Падлік паступленьняў ясных даходаў.

5. Падлік аблігацый дзяржаўных пазык.

6. Бухгальтэрскую справаздачнасьць па пазыках (падлік руху аблігацый у партфэлі Дзяржбанку).

7. Разьлік з контрагентамі па дзяржаўных пазыках.

З. ПРА ДЗЯРЖ. ФІНАНСАВЫ КАНТРОЛЬ:

1. Дзяржаўны фінансавы кантроль ліквідаваць.

2. У зьвязку з гэтым кантрольную работу ўсклясьці на органы РСІ і рэвізійныя камісіі (раённыя і сельскія):

а) органы РСІ праводзяць сваю працу, галоўным чынам, праз арганізацыю кантролю мас за дзейнасьцю савецкіх устаноў, асабліва ўжываючы метад арганізацыі для гэтай мэты часовых кантрольных камісій з рабочых прадпрыемстваў, а таксама ўцягваючы ў гэту працу секцыі РСІ саветаў;

б) на раённыя рэвізійныя камісіі ўскладаецца кантроль за правільнасьцю і гаспадарчай метазгоднасьцю выдаткаваньня на адміністрацыйна-кіраўнічыя, аперацыйныя выдаткі і будаўніцтва ўстановамі, што знаходзяцца на тэрыторыі раёну і ўтрымоўваюцца як на мясцовым, так і на дзяржаўным бюджэтах.

Таксама на рэвізійныя камісіі ўскладаецца нагляд за пастаноўкай рахункаводзтва і справаздачнасьці ў гэтых установах, за цэласьцю і захаванасьцю грашовых і матарыяльных сродкаў, рэвізіі кас спэцыяльных зборшчыкаў, лясьніцтваў, народных судоў і інш.;

в) кантроль за выдаткаваньнем сродкаў дзяржаўнага бюджэту на фінансаваньне народнае гаспадаркі і правядзеньне асобных буйных мерапрыемстваў ажыцьцяўляецца органамі РСІ.

Органамі РСІ ажыцьцяўляецца таксама непасрэднае сталае кіраўніцтва і інструктаваньне рэвізійных камісій;

г) ва ўсіх раёнах Віцебскай акругі ўстанавіць інстытут платных старшынь камісій РСІ, пашырыўшы правы гэтых камісій. Старшыні камісій РСІ адначасова зьяўляюцца старшынямі раённых рэвізійных камісій і кіруюць работай секцый РСІ (раённай, сельсавецкай і гарадзкіх саветаў пе-акруговых гарадоў).

III. У галіне сельскай і лясной гаспадаркі.

1. Ліквідаваць на Віцебскай акрузе раённыя і акруговую зямельныя камісіі, перадаўшы спрочныя зямельныя справы на вырашэньне ў народныя суды і сельскія суды. Усе землеўпарадчыя справы і праекты (спрачныя і бясспрэчныя) разглядаюцца і зацьверджаюцца канчаткова прэзыдыумам раённага выканаўчага камітэту.

2. Лесаўпарадчыя партыі, пакуль ня будзе скончана лесаўпарадкаваньне Акругі (у 1929/30 г.) пакінуць пры Акруговым Выканаўчым Камітэце.

3. Ліквідаваць акруговы землеўпарадчы архіў, чарцёжную і інструментальную камэру, арганізаваўшы гэтакія пры раённых выканаўчых камітэтах, перадаўшы апошнім увесь знаходзячыйся плянавы матэрыял і інструменты.

4. У адпаведнасьці з рэарганізацыяй Акруговага Зямельнага Аддзелу, увесьці наступныя зьмены, перадаўшы:

А. ПА НАРКАМЗЕМУ

а) Праверка гандлю і промыслаў на тэрыторыі сельскіх саветаў;

а) Правядзеньне дасьледчых і будаўнічых гідратэхнічных работ акруговага значэньня, з складаньнем на іх адпаведных праектаў і зацьверджаньне іх;

б) зацьверджаньне праектаў раённага значэньня коштам вышэй 50.000 рублёў;

в) геобатанічныя дасьледваньні балотаў і забалочаных плошчаў, якія знаходзяцца ў вадазборах рэк;

г) складаньне і зацьверджаньне культур тэхнічных праектаў на вадазборах рэк;

д) выкананьне культуртэхнічных работ на калектыўных фондах;

е) рэкагнасьцыравачнае і дэтальнае дасьледваньне торпавых балот для прамысловых прадпрыемстваў рэспубліканскага значэньня;

ж) складаньне і зацьверджаньне праектаў торпавых гаспадарак рэспубліканскага значэньня;

з) забясьпечаньне раённых выканаўчых камітэтаў геадэзычнымі і іншымі відамі інструментаў, тэхнічнымі прыладамі і дапаможнікамі.

Б. АКРУГОВАМУ ВЫКАНАЎЧАМУ КАМІТЭТУ

а) Плянаваньне, кантроль і інструктаваньне ўсіх мерапрыемстваў па сельскай і лясной гаспадарцы дзяржаўнага і мясцовага значэньня;

б) стварэньне і скарыстаньне каланізацыйных фондаў;

в) разгледжаньне і зацьверджаньне праектаў землеўпарадкаваньня па сутнасьці, калі ёсьць спрэчкі паміж раёнамі і права нагляду за землеўпарадчымі справамі;

г) зацьверджаньне праектаў гідратэхнічных, культуртэхнічных і па агнятрываламу будаўніцтву, коштам ад 10 да 50 тысяч рублёў;

д) арганізацыя работы лесаўпарадчых партый (на 1929/30 г.).

В. РАЁННЫМ ВЫКАНАЎЧЫМ КАМІТЭТАМ

а) складаньне і правядзеньне ў жыцьцё дэтальных плянаў практычных мерапрыемстваў па арганізацыі, замацаваньню і разьвіцьцю сельскае гаспадаркі, яе калектывізацыі і індустрыялізацыі;

б) выкананьне культуртэхнічных работ у сельскагаспадарчых аб'яднаньнях;

ж) дэтальнае дасьледваньне торпавых масываў для сельскагаспадарчых арганізацый і прамысловых прадпрыемстваў раённага і акруговага значэньня;

з) складаньне і зацьверджаньне праектаў торпавых гаспадарак раённага і акруговага значэньня;

і) эксплёатацыя торпавых балот і іншых выканаўцаў;

к) арганізацыя і будаваньне агнятрывалых будынкаў;

л) разгляд і зацьверджаньне землеўпарадчых праектаў, як першай інстанцыяй, па сутнасьці;

м) вядзеньне кніг і альфабэтаў на землеўпарадчаму архіву;

н) выкананьне камэральных работ (дакумэнтаў, плянаў, выкапіровак і інш.), па землеўпарадкаваньню, гідратэхніцы і культуртэхніцы;

о) ажыцьцяўленьне дзяржаўнай зямельнай рэгістрацыі.

Г. СЕЛЬСКІМ САВЕТАМ.

а) складаньне вытворчых і крэдытных плянаў на сельскай гаспадарцы на падставе кантрольных лічбаў раённага выканаўчага камітэту;

б) нагляд за правільным і своечасовым выкананьнем намечаных плянам мерапрыемстваў.

5. У галіне ясное гаспадаркі правесьці наступныя зьмены:

а) арганізаваць у Віцебскай акрузе наступныя ўзмоцненыя лясьніцтвы:

1) Віцебскае лясьніцтва з быўшых Віцебскага, Куньцеўскага і Ўшанавіцкага, на агульнай плошчы 21.814 га.

2) Суражскае лясьніцтва з быўшых Галіноўскага і Астроўскага, на плошчы 31.580 га.

3) Мяжанскае лясьніцтва з быўшых Вярэйцкага і Сьцяпанавіцкага, на плошчы 30.369 га.

4) Гарадокскага лясьніцтва з быўшых Гарадоцкага і Рудзянскага, на плошчы 28.882 га;

б) астатнія 6 лясьніцтваў (Лёзьнянскае, Высочанскае, Бешанковіцкае, Сіроцінскае, Сеньненскае і Чашніцкае), як знаходзячыяся ў адміністрацыйных межах раёну варыраваць у тым выгляцце, у якім яны існуюць у гэты час;

в) нагляд за дзейнасьцю зямельных грамад і выкананьне імі агрэмінімуму.

IV. У галіне гандлю.

А. На Акруговы Выканаўчы Камітэт усклядаецца: набудаваньне загатоўчай і тавараправоднай сеткі, складаньне загатоўчых плянаў на сьвяціне, плянаў завозу хлебапрадуктаў і прамысловых тавараў па Акрузе.

Б. На раённыя выканаўчыя камітэты ўскладаецца:

а) складаньне раённых плянаў загатовак па асобных загатоўчых у разрэзе сельскага савету, а таксама плянаў намесьнага збору;

б) кантроль за выкананьнем загатоўчымі арганізацыямі раёну плянаў загатовак па ўстаноўленым плянамі каляндарным тэрмінам;

в) кантроль за правільнасьцю ужываньня ўстаноўленых Урадам загатоўчых і продажных цэн;

г) дача характарыстыкі рынку на нехапаючых дэфіцытных таварах;

д) нагляд за бесперабойным задаволеньнем раёну хлебам і прамысловымі таварамі, у адпаведнасьці з устаноўленымі Акруговым Выканаўчым Камітэтам плянамі завозу;

е) кантроль за правільным разьмеркаваньнем сярод каперавалага насельніцтва акруговых гарадоў і мястечак і сельскай беднаты хлеба і прамтавараў;

ж) кантроль за правільным выкананьнем гандлюючымі арганізацыямі раёнаў прамтавараў і хлеба мэтавага прызначэньня (фонд прэм'яваньня загатовак);

з) вывучэньне эканамічнага становішча раёну па ўсіх відах разьвіцьця сельскагаспадарчае сыравіны і яе галоўнейшага мэтавага накіраваньня, вышукваньне новых другарадных відаў экспартнай сыравіны;

і) плянаваньне і раёнаваньне тавараправоднай сеткі і загатоўчай сеткі раёну;

к) вырашэньне спрэчных пытаньняў паміж загатоўчымі арганізацыямі раёну;

л) нагляд за арганізацыяй грамадзкага харчаваньня насельніцтва ў гарадох і буйных мястэчках раёну;

м) вядзеньне гандлёвага рэестру ў адпаведнасьці з існуючымі на гэтым пытаньні законамі па рэгістрацыі прыватных прадпрыемстваў на тэрыторыі раёну, а таксама і філіялаў патрэб кааперацыі, рознага роду таварыстваў і іншых каперацыйных аб'яднаньняў, прадпрыемстваў па выданьню і распаўсюджваньню твораў друку і рэгістрацыя рынкавых камітэтаў і гандлёвых кніг гандлёвых прадпрыемстваў раёну;

н) рэгістрацыя і нагляд за прыватнымі скупшчыкамі сельскагаспадарчае сыравіны і іншых прадуктаў на тэрыторыі раёну;

о) надаць права раённым выканаўчым камітэтам выдаваць абавязковыя пастановы пра парадак гандлю, час адчыненьня і зачыненьня гандлёвых прадпрыемстваў і іншых мерапрыемстваў, у адпаведнасьці з выданымі для гэтага законамі вышэйшых органаў.

В. На Віцебскі Гарадзкі Савет ускладаецца:

а) устанаўленьне часу гандлю і перавод гандлёвых прадпрыемстваў на бесперарыўны гандлёвы тыдзень;

б) вырашэньне пытаньняў аб адчыненьні і зачыненьні гарадзкіх гандлёвых прадпрыемстваў (дзяржаўных, каперацыйных, грамадзкіх і прыватных), а таксама аб адчыненьні базараў, кірмашоў і рознага роду пляцовак для гандлю, арганізацыя рынкавых камітэтаў, кіраўніцтва іх працай і зацьверджаньне іх каштарысаў і плянаў;

в) вырашэньне ўсіх пытаньняў па грамадзкаму харчаваньню горада і пашырэньню грамадзкага хлебапячэньня;

г) рэгуляваньне дзяржаўнага, каперацыйнага і грамадзкага гандлю ў горадзе з пункту гледжаньня выстарчальнасьці тавараправоднай сеткі, вызначэньня патрэбнай колькасьці прадуктаў і прамысловых тавараў для задаволеньня гарадзкога насельніцтва, разьмеркаваньне тавараў, устанаўленьне норм выдачы дэфіцытных тавараў, устанаўленьне парадку выдачы, ажыцьцяўленьне патрэбных мер да спынэньня чаргі ў гандлі, забясьпечаньне гандлю адпаведнымі памяшканьнямі і набудова на меры патрэбы новых, больш удасканаленых гандлёвых памяшканьняў у відзе закрытых базараў і г. д.;

д) вырашэньне спрэчных пытаньняў гандлёвых арганізацый між сабою і між гандлем і прамысловымі прадпрыемствамі гораду як у галіне задаволеньня і збыту, так і ў галіне загатовак;

е) рэгуляваньне і кантроль загатоўчых і продажных цэн і нацэнак гарадзкіх загатоўчых арганізацый і гандлёвых арганізацый;

ж) устанаўленьне цэн за карыстаньне гарадзкім транспартам пры перавозцы цяжараў;

з) рэгістрацыя прыватных гандлёвых прадпрыемстваў, таксама дзяржаўных, каперацыйных і грамадзкіх прадпрыемстваў і іх філіялаў, прадпрыемстваў па выданьню і распаўсюджваньню твораў друку, а таксама рэгістрацыя рынкавых камітэтаў і рэгістрацыя гандлёвых кнігагандлюючых арганізацый гораду ў адпаведнасьці з дзейным заканадаўствам;

і) асобная рэгістрацыя сезонных скупшчыкаў і нагляд за прыватнымі скупшчыкамі ў горадзе сельскагаспадарчае сыравіны і іншых прадуктаў;

к) складаньне плянаў і арганізацыя гарадзкога збору другарадных відаў экспартнае сыравіны, а таксама кантроль за захаваньнем устаноўленых загатоўчых цэн на другарадныя віды сыравіны;

л) рацыяналізацыя гандлёвага апарату гораду з мэтай прыстасаваньня яго да найлепшага абслугоўваньня спажыўца;

м) выданьне на ахове здароўя і санітарнай справе па гораду і раёнам перадаць адпаведна—Гарадзкому Савету і раённым выканаўчым камітэтам.

У адпаведнасьці з гэтым увесьці ў штат раённых выканаўчых камітэтаў і Гарадзкога Савету патрэбны кадр працаўнікоў.

К. Кіраўніцтва і нагляд за работаю фармакіраўніцтва—усклясьці на акруговы выканаўчы камітэт.

5. Агульнае кіраўніцтва і нагляд за сеткаю і работаю ўстаноў аховы матэры і дзіцяці ўсклясьці на раённыя выканаўчыя камітэты і Гарадзкі Савет.

6. Працу па ахове здароўя дзяцей, фізкультуры, сярод піянэраў і інш. на гораду ўсклясьці на дзіцячы дыспансэр, на яго-ж усклясьці доктарскі кантроль над фізычным выхаваньнем насельніцтва. У раённай, дзе няма пункту аховы здароўя дзяцей і фізкультуры, работу гэту ўсклясьці на раённых санітарных дактароў.

7. Усю гаспадарчую работу, будаўніцтва і рамонты, пытаньні плянавага задавальненьня харчамі, спэцыяльным інвэнтаром і абсталяваньнем, а таксама і рэгуляваньне задавальненьня медыкамэнтамі перадаць непасрэдна ў раёны—раённым выканаўчым камітэтам, а ў горадзе—Гарадзкому Савету.

8. Непасрэдную пасылку на спэцыяльнае лячэньне ў межах БССР, калі такога няма ў акрузе, усклясьці на раённыя, гарадзкія лекавыя ўстановы, а пасылку ў іншыя цэнтральныя гарады СССР усклясьці на лекавыя ўстановы акруговага значэньня, якія знаходзяцца ў веданьні Віцебскага Гарадзкога Савету.

9. Выдачу пратэзаў (зубы, акуляры, бандажы і інш.) рабіць праз раённыя, гарадзкія лекавыя ўстановы.

10. Патранаж над душэўна-хворымі перадаць адпаведным лекавым установам, усклаўшы на іх і ўсю перапіску па пытаньнях апекі.

11. Адбор у санаторыі і на курорты ўсклясьці ў горадзе на адпаведныя лекавыя ўстановы, а ў раёнах—па раённыя больніцы.

VII. У галіне сацыяльнага забясьпечаньня.

1. Усю апэрацыйную работу па сацыяльнаму забясьпечаньню ў горадзе перадаць Гарадзкому Савету, у зьвязку з чым усклясьці на Гарадзкі Савет наступныя функцыі:

а) агульнае кіраўніцтва і напрамак дзейнасьцю сацыяльнага забясьпечаньня;

б) кіраўніцтва дзейнасьцю інвалідных каапэрацыйных арцеляў і працоўным упарадкаваньнем кантынгэнту сацыяльнага забясьпечаньня ў адпаведнасьці з дырэктывамі вышэйшых органаў;

в

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Нар. Камісараў БССР пра рэарганізацыю акругова-раённай сыстэмы кіраўніцтва Віцебскай вопытна-паказальнай акругі*)

віду ўскласьці на гарадзкія, местачковыя і сельскія саветы.

7. Падлік чужаземцаў, вядзеньне спраў па ўезду і выезду заграніцу, а таксама і выдачу чужаземцам пасьведчаньняў аб саюзным грамадзянстве ўскласьці на сэкратарыят акруговага выканаўчага камітэту, з перадачаю апошняму ўсяго справаводзтва аб чужаземцах.

8. Існуючае пры адміністрацыйным аддзеле бюро прымусовых работ рэфармірава ць.

Бягучыя справы на асоб, якія адбываюць і павінны адбываць прымусовыя работы, перадаць адміністрацыйным частям гарадзкога савету і раённым выканаўчым камітэтам, па якіх і ўскласьці арганізацыю прымусовых работ.

9. Пытаньні падрыхтоўкі і нагляду за ажыцьцяўленьнем дагавораў па пытаньнях культу, рэгістрацыі таварыстваў, якія ня маюць на мэце атрыманьня прыбыткаў, ускласьці на адміністрацыйныя часткі гарадзкога савету і раённых выканаўчых камітэтаў.

10. Існуючыя пры папраўным доме наглядальную і разьмярковачную камісіі ліквідаваць утварыўшы замест іх адну разьмярковача-наглядальную камісію.

XI. У галіне судовай.

А. ПЫТАНЬНІ ПАДСУДНАСЬЦІ І КАМПЭТЭНЦЫІ СУДОЎ РОЗНЫХ ІНСТАНЦЫЙ.

1. Пашырыць падсуднасьць народнага суда праз перадачу яму ўсіх крымінальных і грамадзянскіх спраў з акруговага суда, як суда першай інстанцыі, за выключэньнем спраў, па якіх Крымінальным Кодэксам прадугледжанага вышэйшая мера сацыяльнай абароны, і спраў пэрсанальнай падсуднасьці, якія як і раней застаюцца падсуднымі акруговаму суду.

Акруговы суд па ўзгадненьні з акруговым пракурорам і акруговы пракурор па ўзгадненьні з акруговым судом—маюць права: першы—прыняць да свайго справаводзтва, а другі—перадаць на разгляд акруговага суда, у якасьці суда першай інстанцыі ўсякую крымінальную або грамадзянскую справу, падсудную нарсуду, калі яна мае вялікае грамадзка-палітычнае значэньне.

2. Адначасна з пашырэньнем падсуднасьці нарсудоў і з мэтай сапраўднага прыбліжэньня суда да насельніцтва і да. сягненьня хуткага разгляду судовых спраў, апошнія павінны быць разгружаны ад дробных грамадзянскіх і крымінальных спраў, праз арганізацыю таварыскіх оудоў на фабрычна-заводзкіх прадпрыемствах, дзяржаўных і грамадзкіх установах і судоў пры ўсіх сельскіх саветах акругі і пашырэньня іх падсуднасьці.

3. Пашырыць падсуднасьць таварыскіх судоў. Апроч спраў, паказаных у пастанове ЦВК і СНК БССР за 1 верасьня 1928 г. аб таварыскіх судох (З. З. БССР 1928 г., № 26, арт. 255), даць ім права разглядаць:

а) справы аб пабоях і лёгкіх цялесных пашкоджаньнях (п. „а" арт. 223 К.К);

б) аб распаўсюджваньні заведама несапраўдных, ганьбуючых другую асобу, зьвестак (паклёп—арт. 239 КК);

в) аб зьневажаньні дзеяньнем або словам (арт. 237 КК);

г) аб самаўпраўстве ў пяршыню (арт. 131 КК);

д) аб неквaліфікаваным хуліганстве ў пяршыню (арс. 107, ч. 1-я КК);

е) аб пакражах у рабочых і служачых на прадпрыемствах, установах або ў рабочых інтэрнатах, на суму ня больш 50 руб.

ж) аб пакражах матар'ялаў і сродкаў вытворчасьці на суму ня больш 50 р.;

з) аб парушэньні працоўнай дысцыпліны (спазьненьні, прагулы невыканаўне распараджэньняў і г. д.), калі справа перадана таварыскаму суду самой адміністрацыяй, або, калі яна хоць і паднята грамадзкай арганізацыяй або рабочымі, але адміністрацыя не супярэчыць супроць разбору данае справы таварыскім судом;

і) дробныя справы, якія адбіваюць штодзённыя адмоўныя бакі рабочага быту, азартныя гульні, выпадкі п'янства, скандалы, парушэньне правіл унутранага парадку ў інтэрнатах;

к) справы па грамадзянскіхісках на суму да 50 руб., якія падымаюцца з боку прыватных асоб, а таксама грамадзкіх арганізацый.

4. Таварыскі суд, які разглядае справу па абвінавачаньню тае-ж асобы ў другі раз (паўторная судзімасьць) перадае гэту справу на разгляд у народны суд.

5. Таварыскія суды разглядаюць:

а) справы ня толькі паміж рабочымі і служачымі данага прадпрыемства або ўстановы, але і паміж членамі іх сямей;

б) справы, якія ўзьнікаюць паміж рабочымі і служачымі розных прадпрыемстваў аднаго райёну, дзе таварыскія суды арганізаваны, разглядаюцца ў таварыскім судзе таго прадпрыемства або ўстановы, дзе працуе абвінавачваемы або адказчык.

6. Падсуднасьць судоў пры сельскіх саветах пашыраецца наступнымі катэгорыямі спраў:

а) справы пра пабоі і лёгкія цялесныя пашкоджаньні (п. „а" арт. 223 КК);

б) пра распаўсюджваньне заведама непраўдзівых абражаючых другую асобу зьвестак (паклёп, арт. 239 КК);

в) аб зьняважаньні дзеяньнем, словамі (арт. 237 КК);

г) пра самаўпраўства (арт. 131 КК);

д) пра крадзежы ўняршыню да 25 р. (п. „а" арт. 240 КК);

е) грамадзянскія іскі на суму да 50 р.;

ж) спрэчкі, што ўзьнікаюць з працоўнага землякарыстаньня паміж асобнымі гаспадаркамі;

з) спрэчкі аб аднаўленьні парушанага землякарыстаньня паміж асобнымі гаспадаркамі;

і) пра парушэньне скарыстаньня праездамі і перавулкамі;

к) пра страты ад перакосу і перапашкі адным членам зямельнае грамады ў другога, а таксама і ад патраў;

л) пра пастаноўку агароджы і пра пасадку насаджэньняў па межах сяліб і пра страты ад гэтага;

м) пра пабудаваньне на межах землякарыстаньня пабудоў, якія парушаюць інтарэсы суседзяў (канавы, запруды, калючая агароджа і г. д.) і аб стратах ад гэтага;

7. Як таварыскімі судамі, так і судамі пры сельскіх саветах могуць ужывацца наступныя меры ўплыву:

а) папярэджаньне; б) грамадзкае ганьбаваньне з агалашэньнем або без агалашэньня на агульным сходзе рабочых, служачых або на сельскім сходзе ці ў друку; в) штраф да 25 р. на грамадзка-культурныя патрэбы; г) прымусовыя работы да 2 тыдняў; д) перавод на ніжэйшы разрад і менш кваліфікаваную працу.

Пастановы сельскіх і таварыскіх судоў пры адмове ад дабравольнага выкананьня, выконваюцца ў прымусовым парадку: рашэньні таварыскіх судоў—адміністрацыяй або міліцыяй, а сельскіх судоў—сельскімі выканаўцамі.

8. У гарадзкіх паселішчах на адпольках падставах з таварыскімі судамі арганізуюцца і дзейнічаюць суды пры зьбуйнёных жыльлёвых таварыствах, жылішча-арэндных каапэратывах, дамовых трэстах або гарадзкіх і райённых саветах.

9. У выпадку ўзьнікненьня спрэчак паміж працоўнымі і асобамі з непрацоўных элемэнтаў (пазбаўленых выбарчых праў) справа разглядаецца ў таварыскім або ў сельскім судзе, калі абвінавачваемы альбо адказчык працоўны, і ў народным судзе, калі ён зьяўляецца непрацоўным элемэнтам.

10. У выпадку разгляду справы паміж грамадзянамі, якія жывуць у розных сельскіх саветах, справа разглядаецца ў тым сельскім савеце, на тэрыторыі якога жыве абвінавачваемы або адказчык.

11. У сувязі з ліквідацыяй акруговых зямельных камісій, на акруговы суд ускладаецца:

а) вырашэньне зямельных спрэчак пра землякарыстаньне паміж райёнамі;

б) спрэчкі пра дзяржаўную маемасьць рэспубліканскага значэньня і пра скасаваньне дагавораў на гэту маемасьць;

в) вырашэньне скарг, якія падаюцца на рашэньні і вызначэньні народных судоў па зямельных справах, у якасьці суду другое інстанцыі.

Б. КАСАЦЫЙНЫ ПАРАДАК РАЗГЛЕДЖАНЬНЯ СПРАЎ.

У адносінах касацыйнага парадку разгледжаньня спраў устанавіць наступнае:

а) рашэньні таварыскіх судоў і судоў пры сельскіх саветах не падлягаюць касацыйнаму абскаржаньню;

б) пракурор не павінен прымаць скарг у парадку нагляду на рашэньні і прысуды суду першай інстанцыі да скасаваньня касацыйнага тэрміну, а пры падачы касацыйнай скаргі—да разгледжаньня апошняй.

В. ПАРАДАК НАГЛЯДУ І РЭВІЗІІ.

У адносінах парадку нагляду і рэвізіі ўстанавіць наступнае:

а) нагляд за дзейнасьцю сельскіх і таварыскіх судоў ускладаецца на народных судзьдзяў, якія прымаюць да свайго разгляду ўсе скаргі, што падаюцца ў парадку нагляду;

б) народныя судзьдзі маюць права апрэтэстоўваць рашэньні сельскіх і таварыскіх судоў і паставіць апрэтэставаную справу на разгляд яе па сутнасьці ў народным судзе;

в) нагляд за прысудамі і рашэньнямі народных судоў і Акруговага Суду па крымінальных, грамадзянскіх і зямельных справах ускладаецца выключна на пракуратуру.

Акруговы Суд можа патрабаваць справы з народных судоў толькі пры правядзеньні рэвізіі або для вывучэньня асобных катэгорый спраў. Гэты-ж парадак устанаўляецца і для Вышэйшага Суду ў адносінах патрабаваньня спраў з судоў Віцебскае акругі;

г) Тэрмін для падачы скарг у парадку нагляду па крымінальных, грамадзянскіх і зямельных справах абмяжоўваецца адным годам.

Г. СУДОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ.

Інстытут судовых выканаўцаў скасоўваецца. Функцыі судовых выканаўцаў як у гораде, гэтак і на райёне ўскладаюцца на міліцыю.

Д. ПРАКУРАТУРА СЬЛЕДЗТВА.

1. Акруговая Пракуратура пакідаецца ў цяперашнім відзе. Акруговай Пракуратуры даецца права прыпыняць выкананьне любога прысуду і рашэньня народных судоў.

2. У г. Віцебску ўводзіцца пасада пракурора гор. Віцебску.

3. Замест існуючых у райёнах памочнікаў пракураў уводзіцца інстытут вучасткових пракураў; пры іх тэхнічны апарат у складзе аднаго тэхнічнага сэкратара. Вучастковым пракурорам даецца права аддаваць пад суд спыняць сьледчыя справы, апрэтэстоўваць рашэньні і прысуды народных судоў і накіроўваць іх непасрэдна ў Акруговы Суд;

4. Лік сьледчых вучасткаў устанаўляецца па колькасьці райёнаў у складзе аднаго народнага сьледчага ў кожным райёне.

5. Папярэднія сьледзтва абавязкова: а) пра прысваеньне або растрату і крадзеж з дзяржаўных, грамадзкіх або капэрацыйных устаноў (п. „б" арт. 204 і п. „б" арт. 205 КК);

б) пра заключэньне шкодных дагавораў або угод службовую асобаю (арт. 206 КК);

в) пра дачу і атрыманьне кабару і пра правакацыю хабару (п. „б" арт. 207, п. „б" арт. 208 і арт. 209 КК);

г) пра разбой, зроблены групаю асоб або з ужываньнем зброі (п. п. „б" і „в" арт. 247 КК);

д) пра падпал (арт. 262 КК);

е) злачынства на глебе распальваньня варожасьці паміж нацыянальнасьцямі (арт. 84 КК);

ж) супроць-савецкая агітацыя, прапаганда і распаўсюджваньне антысавецкай літаратуры (арт. 103 КК);

з) па справах, якія падсудны Віцебскаму Акруговаму і Найвышэйшаму Судам.

Па ўсіх іншых справах, па якіх папярэдняе сьледзтва неабавязкова, яно можа праводзіцца ня інакш як па распараджэньню Пракурора па матываванай пастанове суду.

Е. ПАРАДАК НАКІРАВАНЬНЯ СПРАЎ У СУД.

Парадак накіраваньня спраў у суд устанаўляецца наступны:

а) справы, па якіх праводзілася папярэдняе сьледзтва і якія падсудны народным судам, сьледчыя накіроўваюць у суд праз вучастковага пракурора;

б) справы, падсудныя акруговаму суду, накіроўваюцца ў суд праз акруговага пракурора;

в) сьледчыя накіроўваюць дазнаньні ў нарсуд у парадку п. 3 арт. 105 КПК;

г) органы дазнаньня непасрэдна, мінуючы сьледчага, накіроўваюць у суд усе справы, па якіх адпаведнымі артыкуламі Крымінальнага Кодэксу прадугледжана пазбаўленьне волі да 3-х гадоў у парадку п. 2, арт. 105 КПК;

д) усе справы, якія патрабуюць папярэдняга сьледзтва, спыняюцца пракурорам;

е) усе справы органаў дазнаньня, па якіх папярэдняе сьледзтва не абавязкова, спыняюцца народным сьледчым у камеры органу дазнаньня, за выключэньнем спраў, прадугледжаных п. „г" гэтай пастановы, якія спыняюцца непасрэдна органамі дазнаньня.

Ж. АРБІТРАЖНЫЯ СПРАВЫ:

Усе справы, якія вырашаюцца ў арбітражным парадку, перадаць у народны суд.

XII. У галіне мясцовай прамысловасьці.

1. Уся мясцовая дзяржаўная прамысловасьць акругі па тэрытарыяльнай адзнаце падзяляецца на Віцебскую гарадзкую і раённую, з непасрэдным падпарадкаваньнем гарадзкіх прадпрыемстваў Віцебскаму Гарадзкому Савету, а раённых—адпаведнаму раённаму выканаўчаму камітэту.

2. Усе прадпрыемствы мясцовай дзяржаўнай прамысловасьці г. Віцебску абʼядналь ць у адзін гарадзкі прамысловы трэст.

3. Усе прадпрыемствы мясцовай прамысловасьці на раёнах абʼядноваюцца па тэрытарыяльнай адзнацы ў раённыя прамысловыя камбінаты.

4. Пытаньні фінансаваньня прадпрыемстваў, забясьпечаньня сырцом, імпартнымі матар'ялам, таварамі і абсталяваньнем перадаць адзначаным трэстам і камбінатам.

4. Устанавіць наступныя функцыі органаў улады ў галіне мясцовай прамысловасьці:

А. АКРУГОВЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ.

а) агульнае кіраўніцтва, плянаваньне і кантроль дзейнасьці ўсёй мясцовай прамысловасьці;

б) нагляд за правільным ажыцьцяўленьнем трэстамі і камбінатамі дырэктыў акруговага выканаўчага камітэту і ВСНГ, тэхнічнае інспэктаваньне і інструктаваньне прадпрыемстваў і абʼяднаньняў (абсьледчая праца), а таксама кантроль і інструктаваньне ў адносінах пастаноўкі бухгальтарскага падліку і справаздачнасьці;

в) рэгуляваньне вышукальных работ для новага будаўніцтва;

г) кіраўніцтва работаю на мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў;

д) агульнае кіраўніцтва саматужнаю прамысловасьцю і вырашэньне пытаньняў новага прамысловага будаўніцтва, а таксама пашырэньне і рэканструкцыі прыватнай прамысловасьці.

В. ВІЦЕБСКІ ГАРАДЗКІ САВЕТ І РАЙВЫКАНКОМЫ.

а) непасрэднае кіраўніцтва дзейнасьцю падпарадкаваных трэстаў і камбінатаў і кантроль іх дзейнасьці;

б) зацьверджаньне і падача ў ВСНГ са сваім заключэньнем вытворча-фінансавых плянаў прадпрыемстваў, падпарадкаваных абʼяднаньню;

в) распрацоўка разам з падпарадкаванымі трэстамі і камбінатамі плянаў будаўніцтва, пашырэньня і рэканструкцыі прадпрыемстваў, распрацоўка плянаў крэдытаваньня, рэалізацыя прадукцыі, электрыфікацыя прадпрыемстваў, забясьпечаньне іх сырцом, палам і іншымі матар'ялам, а таксама вырашэньне пытаньняў адчыненьня, рэарганізацыі і ліквідацыі прамысловых прадпрыемстваў і абʼяднаньняў;

г) назначэньне, перамяшчэньне і звальненьне дырэктароў трэстаў і камбінатаў;

д) разгляд і зацьверджаньне справаздач і балянсаў прамысловых абʼядананьняў і разьмеркаваньне прыбыткаў;

е) рэгуляваньне і падлік адпушчаемых сум па прамфонду на будаўніцтва прамысловасьці і нагляд за скарыстаньнем яго па прызначэньні;

ж) распрацоўка і падача заявак на імпартныя тавары і абсталяваньне;

з) кіраўніцтва саматужнаю прамысловасьцю і рэгістрацыя статутаў арцеляў ў апэрацыйную дзейнасьць прадпрыемства і зьмены ўстаноўленага прамфінплану.

XIII. У галіне рэспубліканскай і саюзнай прамысловасьці.

Акруговаму Выканаўчаму Камітэту даецца права нагляду і праверкі работы ўсіх прадпрыемстваў рэспубліканскай і саюзнай прамысловасьці бяз умешваньня

XIV. У галіне камунальнай гаспадаркі.

1. Усе муніцыпалізаваныя будынкі, за выключэньнем нованабудаваных цалкам перадаць Жакт'ам.

Для эксплёатацыі новабудуемых будынкаў арганізаваць кіраўніцтва дамамі на правах самастойнага гаспадарчага абʼяднаньня.

Перадаць таксама Жакт'ам і ўсе гандлёвыя памяшканьні, абумовіўшы дагаворам здачу вядомага процанту ад даходу ў бюджэт Гарадзкога Савету.

У непасрэдным веданьні Гарадзкога Савету пакінуць толькі асобныя гандлёвыя памяшканьні.

2. Спагнаньне і падлік арэндай платы за камунальную маёмасьць ускласьці на абʼяднаную бухгальтэрыю Гарадзкога Савету

XV. У галіне раёнаваньня.

1. Ліквідаваць Езярышчанскі раён, злучыўшы яго цалкам з Гарадокскім раёнам.

2. Абʼяднаць: а) Чэрнаскі сельсавет з Вярхоўскім сельсаветам, Бешанковіцкага раёну, б) Ровенскі сельсавет з Валатоўскім, Сіроцінскага раёну, в) Падварэцкі сельсавет з Машчанскім, Сеньненскага раёну.

3. Даручыць НКУС у месячны тэрмін распрацаваць і падаць у СНК свае прапановы аб мэтазгоднасьці далучэньня Багушэўскага раёну да Віцебскай акругі.

XVI. Аб парадку назначэньня, перамяшчэньня і звальненьня працаўнікоў.

Устанавіць наступны парадак назначэньня, перамяшчэньня і звальненьня працаўнікоў:

1. Раённыя выканаўчыя камітэты і Гарадзкі Савет самастойна назначаюць, перамяшчаюць і звальняюць усіх бяз выключэньня загадчыкаў установамі, апэрацыйных працаўнікоў, спэцыялістаў і супрацоўнікаў апарату.

2. Супрацоўнікі ўстаноў, падпарадкаваных раённаму выканаўчаму камітэту, Гарадзкому Савету і Акруговаму Выканаўчаму Камітэту, назначаюцца, перамяшчаюцца і звальняюцца загадчыкамі гэтых устаноў.

3. За Акруговым Выканаўчым Камітэтам пакідаецца назначэньне, перамяшчэньне і звальненьне супрацоўнікаў апарату Акруговага Выканаўчага Камітэту і загадчыкаў устаноў, непасрэдна падпарадкаваных Акруговаму Выканаўчаму Камітэту.

XVII. Аб парадку кіраўніцтва цэнтральнымі органамі БССР віцебскімі акруговымі ўстановамі.

1. Як агульнае правіла, усе законы, інструкцыі і абежнікі, якія зьмяшчаюцца ў афіцыйных выданьнях наркаматаў СССР, у Бюлетэні СНК БССР, у Зборы Законаў СССР і БССР і ў газэце „Савецкая Беларусь" асобна на месцы не рассылаюцца.

Увага: У выключных выпадках, пры пільнай патрэбе ўвесьці тую ці іншую пастанову з моманту яе выданьня, наркаматы, незалежна ад яе апублікаваньня, рассылаюць яе мясцом.

2. Пастановы, інструкцыі, загады і абежнікі, не належачыя агалашэньню рассылаюцца наркаматамі Гарадзкому Савету і раённым выканаўчым камітэтам непасрэдна.

3. Дырэктыўна-інфармацыйныя лісты наркаматаў, як напрыклад: аб кан'юнктуры і становішчы тых ці іншых пытаньняў гаспадарчага жыцьця, рассылаюцца апошнімі Гарадзкому Савету і раённым выканаўчым камітэтам непасрэдна.

4. Абежнікавыя паказаньні, якія патрабуюць мясцовай прапрацоўкі для ўжываньня да ўмоў мясцовай сапраўднасьці, перасылаюцца толькі Акруговаму Выканаўчаму Камітэту.

5. Па пытаньнях, якія тычацца толькі сельскай і лясной гаспадаркі або арганізацыі работ, якія знаходзяцца па-за гарадам, матар'ял перасылаецца непасрэдна раённым выканаўчым камітэтам і сельскім саветам, з адбіткам Акруговаму Выканаўчаму Камітэту.

6. Усе паказаньні, якія маюць дачыненьне да рабочых, занятых у дзяржаўнай і мясцовай прамысловасьці рассылаюцца адпаведна Гарадзкому Савету і раённым выканаўчым камітэтам, з копіяй Акруговаму Выканаўчаму Камітэту.

7. Матар'ялы, якія патрабуюць папярэдняй прапрацоўкі і заключэньня мясцовых органаў, у залежнасьці ад важнасьці пытаньня, накіроўваюцца і ўзгадняюцца наркаматамі з Акруговым Выканаўчым Камітэтам, Гарадзкім Саветам, раённымі выканаўчымі камітэтамі і сельскімі саветамі (у выбарачным парадку).

XVIII. Пра тэрміны правядзеньня ў жыцьцё гэтае пастановы.

1. Тэрмінай пераходу савецкага апарату акругі на новую сыстэму работы вызначыць 15 кастрычніка 1929 г.

2. Даручыць Народнаму Камісарыяту, Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі сумесна з Віцебскім Акруговым Выканаўчым Камітэтам у месячны тэрмін распрацаваць і падаць на зацьверджаньне Ураду палажэньні пра ўсе органы ўлады Віцебскай акругі.

3. Даручыць усім народным камісарыятам і цэнтральным установам у 2-х тыднёвы тэрмін падаць у СНК пералік законаў, якія павінны быць скасаваны, зьмешаны або дапоўнены для Віцебскае акругі, у сувязі з выданьнем гэтай пастановы.

ВЫК. АБ. СТАРШЫНІ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

СТАРШЫНЯ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР М. ГАЛАДЗЕД.

ЗА САКРАТАРА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА БССР КАМІТЭТУ У. ІГНАТОЎСКІ.

12 кастрычніка 1929 г
гор. Менск.

*) Гляді 3-ю стар.

У Прэзыдыуме ЦВК БССР.

12-ГА КАСТРЫЧНІКА Г. Г. ПАД СТАРШЫНСТВАМ ТАВ. А. І. ХАЦКЕВІЧА АДБЫЛОСЯ ЧАРГОВАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК БССР. НА ГЭТЫМ ПАСЯДЖЭНЬНІ РАЗАМ З ІНШЫМІ РАЗГЛЕДЖАНЫ НАСТУПНЫЯ ПЫТАНЬНІ:

Даклад „Савецкай Беларусі".

Заслухан даклад рэдактара газэты „Савецкая Беларусь" тав. Шастакова аб дзейнасьці газэты.

„Савецкая Беларусь" у гэтым годзе шырока разгарнула самакрытыку, змагалася з бюракратызмам, валакітай і з скрыўленьнямі клясавай лініі ў савапараце. „Савецкая Беларусь", як орган ЦВК БССР, зьвярнула асаблівую ўвагу на высьвятленьне пытаньняў савецкага будаўніцтва, працы саветаў і выканкомаў. Высьвятлялася таксама і работа савецкага апарату ў цэлым. У газэце было зьмешчана шмат матар'ялаў, прысьвечаных вылучэнству, чыстцы партыі і савецкага апарату. Вялізнае месца занялі ў газэце пытаньні індустрыялізацыі краіны, узьняцьця сельскай гаспадаркі, калектывізацыі і перабудовы вёскі на сацыялістычны лад. Газэта разгарнула шырокую кампанію па рэалізацыі пазык індустрыялізацыі і папулярызацыі апчаднай справы; усяго на гэтую тэму зьмешчана за справаздачны пэрыяд (з 11-X-28 г. па 1-VIII-29 г.)—293 артыкулы. Шмат растлумачальных, дырэктыўных і крытычных артыкулаў было прысьвечана пытаньням сацыялістычнага спаборніцтва і пераходу на бесперапынны рабочы тыдзень. Значны адбітак на старонках газэты знайшлі пытаньні культурнага будаўніцтва. Шмат зьвернута ўвагі ўзмацненьню абароназдольнасьці краіны. Газэта своечасова адгукалася на розныя кампаніі, рэвалюцыйныя сьвяты і г. д. Пры газэце да апошняга часу выходзілі два штомесячных дадаткі: а) «Саветы Беларусі»—па пытаньнях савецкага будаўніцтва; б) „Працаўнік Асьветы"—па пытаньнях культурнага будаўніцтва. У сваёй штодзённай працы рэдакцыя абапіралася на шырока раскінутую сетку рабселькораў. Лік рабселькораў, якія рэгулярна пішуць у газэту, складае 460 чалавек. Тыраж газэты каля 11.000 экз.

Побач з дасягненьнямі ў працы газэты адзначаецца таксама і шэраг памылак, якія сказаліся ў зьмяшчэньні шкодных з нацыянал-дэмакратычнымі настроямі—артыкулаў без заўваг і выступленьняў супроць іх з боку самой рэдакцыі. Аднак, за апошні час палітычная лінія газэты была выпраўлена. Як дэфэкты неабходна таксама адзначыць—слабае асьвятленьне ў газэце: рабочага жыцьця, пытаньняў нацыяльнасьці, барацьбы з антысэмітызмам.

У спрэчках па дакладу выказаліся т. т. Сташэўскі, Ашароўч, Лукашэвіч, Ігнатоўскі, Карклін, Калпін і Хацкевіч.

Выступаўшыя т. т. побач з іншымі заўвагамі падкрэсьлівалі неабходнасьць большага асьвятленьня ў «Савецкай Беларусі», пытаньняў савецкага будаўніцтва, а таксама і лепшага скарыстаньня тых артыкулаў, якія ня могуць быць зьмешчаны ў газэце, у зьвязку з паступленьнем іх у вялікай колькасьці.

Для распрацоўкі праэкту пастановы па заслуханым дакладзе арганізавана камісія ў складзе т. т. Сташэўскага, Сянькевіча, Ашаровіча, Шастакова, Дубаўцова і Лукашэвіча.

Пра рэарганізацыю сыстэмы кіраўніцтва Віцебскай акругі.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў праэкт пастановы ЦВК і СНК БССР пра рэарганізацыю акругова-раённай сыстэмы кіраўніцтва Віцебскай вопытна-паказальнай акругі. Уся акругова-раённая сыстэма кіраўніцтва рэарганізавана шляхам перадачы значнай часткі апэрацыйных фукцый, якія выконваліся акруговым апаратам, РВК і гарсавету, а тых функцый, які выконваліся раённым апаратам—сельскім і местачковым саветам і гарсаветам акруговых гарадоў. У зьвязку з гэтым, значная частка акруговых работнікаў пераходзіць на работу ў райёны. Апарат АВК, РВК і гарсаветаў павінен быць пабудован на прынцыпу адказных выканаўцаў.

Вялікія правы прадастаўляюцца сельскім і гарадзкім саветам і РВК-ам у галіне фінансава-падатковай. Ва ўсіх бяз выключэньня сельсаветах уводзяцца самастойныя бюджэты. Ліквідуюцца ўсе зямельныя камісіі Віцебшчыны, зямельныя спрэчкі перадаюцца на вырашэньне нарсудоў і сельскіх судоў; усе справы па землеўпарадкаваньні і праэкты разглядаюцца і канчаткова зацьвярджаюцца Прэзыдыумамі РВК. Пры Віцебскім гарсавеце, а таксама пры РВК арганізоўваюцца адміністрацыйныя часткі. Пашырана падсуднасьць народнага суда шляхам перадачы яму шэрагу функцый акруговага суда. Разгрузка нарсудоў ад дробных спраў праводзіцца шляхам арганізацыі таварыскіх судоў па фабрычна-заводзкіх прадпрыемствах, дзяржаўных і грамадзкіх прадпрыемствах і судоў пры ўсіх сельсаветах акругі. Падсуднасьць судоў пры сельсаветах пашыраецца. Загадчыкам паасобных установаў (культурна-асьветных, лячэбных і інш.), прадстаўлена права найму і звальненьня падпарадкаваных ім работнікаў.

Тэрмін пераходу савецкага апарату на новую сыстэму работы вызначан—15-га кастрычніка г.г.

Вынікі ўжываньня кодэксу аб льготах для ваеннаслужачых РСЧА і РСЧФ.

Заслухан даклад Аргаддзелу Прэзыдыуму ЦВК і Аршанскага АВК аб выніках ужываньня кодэксу аб льготах для ваеннаслужачых РСЧА і РСЧФ Саюзу ССР і іх сем'яў.

Кодэкс аб льготах чырвонаармейцам і іх сем'ям ажыцьцяўляецца, але вучот у гэтай галіне пастаўлен нездавальняюча як у большасьці цэнтральных устаноў, так і акрыканкомаў.

Па лініі сацзабясьпекі па дапамогу сем'ям вайскоўцаў выдана: у 1926-1927 г.—72.000 р., у 1927-28 г.—83.000 руб., у 1928-29 г.—105,0 тысяч рублёў. Апрача гэтага, па мясцовых бюджэтах выдзелены спэцыяльныя крэдыты для дапамогі сем'ям вайскоўцаў. Як ненармальнасьць, неабходна адзначыць марудны разгляд хадайнічаньняў аб дапамозе. Льгот па сельскагаспадарчаму падатку за 1927-28 г. прадастаўлена на суму 321.309 руб.

Льгот па акладному страхаваньню (сем'ям вайскоўцаў даецца льгота у разьмеры 1|3 сум страхоўкі) у 1927-28 г., прадастаўлена 26,294 гаспадаркам на суму 64.896 р. Шэраг льгот прадастаўлена на лініі Наркамзему, па земляўпарадкаваньні, землянадзяленьні, забясьпечаньні лесаматар'ялямі і драўнінай, ачыстцы насеньня па жывёлагадоўлі і інш. Вялікія пераваги аказваюцца пры крэдытаваньні. Па лініі НКП дэмабілізаваным даецца праца ў першую чаргу. Льготы, прадугледжаныя па Кодэксу, у галіне асьветы і аховы здароўя ажыцьцяўляюцца, але дакладныя адпаведныя звесткі гэтых наркаматаў адсутнічаюць.

Па Аршанскай акрузе ўлік чырвонаармейцаў пастаўлен незадавальняюча. Лічбы аб аказаньні дапамогі, якія паказаны па матар'ялах, зьмяшчаюцца няпоўнымі. Аднак, пры праверцы дапамогі сем'ям вайскоўцаў па акрузе праведзена значная...

Пастанова па заслуханым дакладзе будзе прынята на наступным пасяджэньні Прэзыдыуму ЦВК БССР.

Аб адтэрмінаваньні скліканьня Сэсіі ЦВК БССР, Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР і Зьезду рабочых і сялянскіх тышоў.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў адтэрмінаваць скліканьне: II-й Сэсіі ЦВК БССР IX-га скліканьня да 13 лістапада, Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР да 1 лістапада, Усебеларускага зьезду рабочых і сялянскіх тышоў—... лістапада г. г.

Парадак дня Сэсіі ЦВК БССР: пытаньнем аб арганізацыі Камісарыяту Земляробства СССР.

Аб увекавечаньні памяці вяр грамадзянскай вайны.

Прэзыдыум ЦВК прыняў к... паведамленьне т. Платуна з Камісіі Прэзыдыуму ЦВК БССР аб увекавечаньні памяці ахвяр грамадзянскай вайны.

Камісію пастаноўлена ліквідаваць. Далейшая праца па выяўленьні могілак загінуўшых рэвалюцыянераў, увекавечаньне памяці апошніх дазвана на аднаго спэцыяльнага чалавека пры музэі Рэвалюцыі, а ўскладзена на працягу паўгода на брацьбу і апрацоўваць усе матар'ялы, гэтым пытаньні і адпаведныя звесткі падаць Прэзыдыуму ЦВК БССР.

Аб матарыяльным забесьпячэньні БССР.

Зацьверджана Натарыяльнае забесьпячэньне БССР.

Гэтым Палажэньнем прадугледжаны функцыі натарыяльных канторы, агульныя правілы ўчыненьня натарыяльных дзеяньняў, парадак іх выкананьня і інш.

Падрыхтоўка да сьвяткаваньня годзьдзя Кастрычніка ва рэвалюцыі.

Пад старшынствам тав. А. І. Хацкевіча пры Прэзыдыуме ЦВК БССР створана Камісія па правядзеньню святкаваньня XII-годзьдзя Кастрычніка рэвалюцыі.

ВЫКАНАНЬНЕ ДАГАВОРАЎ ПА СПАБОРНІЦТВАХ.

Сацыялістычнае спаборніцтва паміж калгасам Аршанчыны пачало разгортавацца ў канцы вясеньняй сяўбы.

Першай ўступіла ў спаборніцтва маладая, арганізаваная ў мінулым годзе, камуна Аршанскага раёну—„10 кастрычнік". Яна тады вызвала на спаборніцтва дзьве іншае камуны—«Араты», Расьнянскага раёну і яшчэ адну Мсціслаўскага раёну. Камуны вызаў прынялі. Пачалася праца на выкананьню дагавораў спаборніцтва. А пра цаваць над чым было: дагаворы былі досыць сур'езныя.

Па гэтым умовам патрэбна было перайсьці на чорны папар, засеяць зімовы клін гатунковым насеньнем, забараніць пасьбу скаціны на зімовых пасевах, пабудаваць сілосную яму, ацяпліць хлявы для скаціны, паставіць дацкія кармушкі, перайсьці на кармленьне кароў па норме і на трохразовую дойку іх, пакрыць чарапічнымі дахамі ўсе будынкі, якія будуць будавацца у гэтым годзе, пабудаваць сьвінарнік, ліквідаваць да першага мая 30 г. нянісьменнасьць сярод камунараў, абсталяваць чырвоны куток і набыць бібліятэчку, а таксама паставіць і радыё гучна-гаварыцель, перайсьці да дню гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі ў гэтым годзе на грамадзкае харчаваньне, правесьці зяблевую ўспашку, дабіцца к будучаму году пашырэньня камуны за лік акаляючага насельніцтва і пашырыць дапамогу вакольнаму сялянству—беднаце і серадняку.

За гэтымі камунамі у сацыялістычнае спаборніцтва сталі ўступаць і іншыя калгасы і на сёньнешні дзень мы маем 105 калгасаў уступіўшых у спаборніцтва паміж сабою. Гэта значыць, што спаборніцтва на палёх калгасаў Аршанчыны яшчэ не разгарнулася дастатковым парадкам, каб ахапіць усе калгасы акругі.

Цяпер застановімся і на тым, як жа выконваюцца умовы па спаборніцтву. Значная колькасьць калгасаў ўступіўшых у спаборніцтва выконвае ўмовы добра. Застануцца ня выкананымі толькі тыя пункты, якія выканаць немагчыма за адсутнасьцю тых ці іншых матар'ялаў і г. д. Але ёсьць і такія калгасы, якія ўступалі у спаборніцтва толькі для таго, каб адбыць фармальнасьць. Такіх зусім малая колькасьць.

Добра і поўнасьцю, наколькі гэта залежала ад іх і ня было перашкод з недахопамі таго ці іншага матар'ялу для выкананьня, выканалі умовы спаборніцтва камуна «10 Кастрычнік»—Аршанскага раёну, камуна імя XII зьезду партыі.

Ня выканае поўнасьцю умоў па спаборніцтву камуна „Араты", Расьнянскага раёну. Ня выканае нават і тых пунктаў, якія-б магла выканаць. Няпрыклад, ня выканае яна пункт аб чарапічных дахах і падмурках у новых будынках, ня гледзячы на тое, што гэта вытворчасьць ёс